Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

16 ВЕРАСНЯ 2023 г. СУБОТА № 180 (30060)

КАЛІ НАСТАЎНІК ВУЧЫЦЬ БАЧЫЦЬ МАСТАЦТВА І ЖЫЦЦЁ 7

ЯК МІНУЛАЕ СТАНОВІЦЦА ЎРОКАМ ДЛЯ БУДУЧЫНІ 13

Апора ва ўмацаванні Айчыны

Дарагія суайчыннікі!

Віншую вас з Днём народнага адзінства!

Гэта свята звяртае нас да знамянальнай даты, што стала найважнейшай вяхой у гісторыі беларускай нацыі, якая, прайшоўшы скрозь боль і выпрабаванні, набыла дзяржаўнасць, суверэнітэт і сусветнае прызнанне.

Падзеі 17 верасня 1939 года заклалі трывалы падмурак для дасягненняў і поспехаў сучаснай Беларусі, абумовілі яе далейшы шлях развіцця.

У аснове нашай згуртаванасці — вернасць памяці продкаў, багатая культурная спадчына, стойкасць і працавітасць, блізкія кожнаму з нас традыцыйныя каштоўнасці.

Беларусы навучыліся быць разам не толькі ў барацьбе, але і ў стварэнні, у сваіх памкненнях і дасягненні мэт. Наша агульная задача — праз дыялог і ўзаемаразуменне памнажаць патэнцыял і славу роднай зямлі, захаваць яе самабытнасць і міжнародны аўтарытэт.

Няхай мір і згода пануюць у кожнай сям'і, а адзінства і патрыятызм заўсёды будуць надзейнай апорай ва ўмацаванні Айчыны.

Жадаю ўсім моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Сям'я Нікіты і Марыі СТУДЭНТ — шматдзетная. Нікіта працуе ўрачом у 15-й гарадской паліклініцы. Марыя знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску па доглядзе дзіцяці. Сёлета яна, дарэчы, атрымала ордэн Маці з рук Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі.

— Дзень народнага адзінства для нашай сям'і — свята не толькі дзяржаўнае, але і ўсёй нашай вялікай сям'і, дзе старэйшыя клапоцяцца аб малодшых, падтрымліваюць адзін аднаго. Адзінства — гэта тое, без чаго мы проста не можам абысціся кожны дзень, — прызнаўся Нікіта Студэнт.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«СПРАБАВАЛІ НАС НАХІЛІЦЬ — НЕ АТРЫМАЛАСЯ. НААДВАРОТ, МЫ МАБІЛІЗАВАЛІСЯ»

Падрабязнасці сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі і Уладзіміра Пуціна

Фота БелТА.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас свайго рабочага візіту ў Расійскую Федэрацыю сустрэўся з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным. Найперш беларускі лідар павіншаваў свайго калегу з сур'ёзным этапам электаральнага цыкла — адзіным днём галасавання, які прайшоў у многіх расійскіх рэгіёнах. «Вынікі зразумелыя, не хачу нават іх аналізаваць, — адзначыў кіраўнік нашай дзяржавы. — Напэўна, наогул ніколі такіх вынікаў не было. Усе вашыя кандыдатуры на пасаду губернатараў народам былі падтрыманы. Гэта вялікі поспех».

У цэнтры ўвагі прэзідэнтаў — пытанні двухбаковага супрацоўніцтва і міжнародны парадак дня. Аляксандр Лукашэнка прагназуе ў наступным годзе выхад на дасанкцыйны ўзровень работы эканомікі. «Мы вырашаем гэтыя ўсе пытанні: і дробныя, і буйныя, — сказаў ён. — Вы маеце рацыю. Спрабавалі нас моцна нахіліць — нічога не атрымалася. Наадварот, неяк мы мабілізаваліся нават нечакана. Я ведаю і для вас, і я не чакаў, што мы можам выстаяць. Так, бядней трошкі жывем, крыху зусім. Думаю, што будучы год у нас будзе добрым годам і мы выйдзем на дасанкцыйны перыяд работы нашай эканомікі. Па дробязях усе пытанні, пачынаючы ад ВПК і іншае, звязаныя з украінскім канфліктам, — усе гэтыя пытанні практычна вырашаны. Калі засталося нешта, то мы ведаем, у якім напрамку нам рухацца».

Што датычыцца інтэграцыйнага супрацоўніцтва, то Аляксандр Лукашэнка адзначыў: службовыя асобы абедзвюх краін нядрэнна папрацавалі, выконваючы даручэнні кіраўнікоў дзяржаў. Больш за 80 % задач, пастаўленых перад урадамі, выкананы. Для работы над Асноўнымі напрамкамі рэалізацыі Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы на 2021—2023 гады і 28 саюзнымі праграмамі яшчэ ёсць тры месяцы. «Думаю, што даціснем і гэтыя пытанні», — заўважыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка таксама расказаў аб дзеяннях па стабілізацыі сітуацыі на паліўным рынку па просьбе расійскага боку. «Хачу вас праінфармаваць — былі некаторыя складанасці на рынку па паліве, стабілізавалі сітуацыю, паставілі столькі, колькі трэба было Расійскай Федэрацыі, — паведаміў кіраўнік дзяржавы. — Колькі ўрад папрасіў. Па-мойму, па 60 тысяч дызпаліва і бензіну. Сітуацыю стабілізуем на нашых агульных рынках. Калі трэба будзе яшчэ скараціць пастаўкі на знешнія рынкі і для ўнутранага спажывання павялічыць — гэта не праблема».

Уладзімір Пуцін заўважыў, што ўзаемаадносіны Беларусі і Расіі стабільна і надзейна развіваюцца. «Мы з вамі працягваем кантакты, кансультацыі наконт нашых адносін і наконт узаемадзеяння, перш за ўсё ў сферы эканомікі, — канстатаваў ён. — Тут усё стабільна, надзейна развіваецца».

Уладзімір Пуцін таксама расказаў, што ў Расіі завяршаецца бюджэтны працэс: «У нас усё стабільна, надзейна, што не можа не радаваць. Чаму пра гэта гавару? Таму што (мы з вамі добра ведаем) стан расійскай эканомікі, вядома, адбіваецца на нашым узаемадзеянні ў рамках Саюзнай дзяржавы. У нас ёсць у сувязі з гэтым узаемныя пытанні, абавязацельствы. Ёсць неабходнасць, мне здаецца, зверыць гадзіннікі па некаторых пытаннях».

СТАР. 2

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2023 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

«СПРАБАВАЛІ НАС НАХІЛІЦЬ — НЕ АТРЫМАЛАСЯ. НААДВАРОТ, МЫ МАБІЛІЗАВАЛІСЯ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Акрамя таго, Уладзімір Пуцін згадаў сваю нядаўнюю сустрэчу з лідарам КНДР, які знаходзіўся ў Расіі з візітам. «Хацеў вас яшчэ праінфармаваць, як прайшла дыскусія па сітуацыі ў рэгіёне, што таксама немалаважна», — адзначыў ён. Прэзідэнт Расіі таксама заявіў аб сваім намеры паразмаўляць з беларускім калегам наконт сітуацыі на ўкраінскім напрамку і вакол украінскага крызісу.

«Я вельмі рады вас бачыць. Дзякуй, што пагадзіліся прыехаць», — падсумаваў ён.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што назіраў за апошнімі працоўнымі днямі свайго калегі. «Прыемна было бачыць вас з Кім Чэн Ынам на касмадроме «Усходні», бо сам быў там, — звярнуў увагу беларускі лідар. — Мы з вамі наведвалі гэты касмадром раней. Я думаю, што мы можам падумаць і аб супрацоўніцтве дзесьці на траіх. Паўночная Карэя, Расія... Ведаю, што цікавасць вялікая ў карэйцаў да вас. Я думаю, кавалак работы і Беларусі там знойдзецца. З улікам тых праблем, якія існуюць».

Прэзідэнт заявіў аб намеры расказаць расійскаму калегу аб супрацоўніцтве з краінамі Афрыканскага кантынента, асабліва з улікам нядаўняга візіту ў Беларусь Прэзідэнта Экватарыяльнай Гвінеі. «Вельмі вядомы чалавек. І сучасны чалавек. Ёсць таксама сумесная работа па афрыканскім напрамку», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Словам, здавалася, што мы ўжо вырашылі ўсе пытанні. А яны ўсё назапашваюцца і назапашваюцца. Таму ёсць неабходнасць своечасова і параіцца, — выказаўся Аляксандр Лукашэнка наконт актуальнасці сустрэчы з Прэзідэнтам Расіі. — Я ўдзячны, што вы знайшлі час, каб параіцца і абмеркаваць дзеянні на будучыню».

Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін адказалі на пытанні журналістаў. Адно з пытанняў Прэзідэнту Расійскай Федэрацыі датычылася заяў на Захадзе аб тым, што яго нядаўняя сустрэча з лідарам КНДР Кім Чэн Ынам спрыяе напружанасці ў рэгіёне і нібыта расійскі бок прасіў накіраваць карэйскіх добраахвотнікаў для ўдзелу ў СВА. Прэзідэнт Расіі абвергнуў падобныя заявы, назваўшы іх поўнай лухтой.

У сваю чаргу Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што заходнікам трэба самім палічыць спачатку, колькі яны накіравалі ўжо сваіх наёмнікаў для ўдзелу ва ўкраінскім канфлікце, перш чым спрабаваць у чымсьці папракаць Расію. Таксама падобныя заявы ён назваў небяспечнымі для Захаду. «Таму што яны спяць і бачаць там свае рэгулярныя воінскія часці. У Польшчы ўжо сфарміраваны каля граніцы, вы ра гэта таксама гаварылі, воінскія часці, гатовыя зайсці ва Украіну. У сваё вока трэба паглядзець і там пашукаць якое-небудзь бервяно, а не папракаць іншых», — параіў беларускі лідар.

Уладзімір Пуцін пагадзіўся са словамі Аляксандра Лукашэнкі. «Дарэчы, мы фіксуем і на полі бою, і ў падраздзяленнях, у якіх праводзіцца падрыхтоўка, замежных наймітаў, замежных інструктараў, — адзначыў Прэзідэнт Расіі. — У нас няма такой неабходнасці — запрашаць для баявых дзеянняў людзей збоку».

Журналісты таксама папрасілі пракаментаваць заяву дзяржсакратара ЗША Энтані Блінкена наконт магчымых мірных перагавораў з Украінай. Высокі прадстаўнік амерыканскага істэблішменту нядаўна вобразна выказаўся, заявіўшы, што Расіі і Украіне ў канчатковым выніку давядзецца «станцаваць танга».

«Што да амерыканцаў, то яны самі не ўмеюць танцаваць гэтага танга, — заявіў расійскі лідар. — Гэта, вядома, выдатная дзівосная музыка і рухі прыгожыя, але ЗША ўсё спрабуюць вырашаць з пазіцыі сілы. Ці з дапамогай эканамічных санкцый, або фінансавых абмежаванняў, пагрозы прымянення ваеннай сілы, або яе прымяненнем. Яны спрабуюць кагосьці вучыць, а самі гэтага рабіць не ўмеюць ці не хочуць. Хутчэй за ўсё, проста не хочуць». Уладзімір Пуцін падкрэсліў, што Расія ніколі не адмаўлялася ад перагавораў. «Таму, калі ласка, калі іншы бок хоча, няхай скажа пра гэта прама», — заўважыў ён.

Разам з тым Прэзідэнт Расіі ўдакладніў: «Танга — гэта, вядома, добра, але для Украіны важна гапак не забыцца. Вось гэта важна. А то так будуць увесь час пад чужую музыку і пад чужую дудку танцаваць. А танцаваць усім так ці інакш давядзецца «Барыню». Ну ці ў лепшым выпадку «Казачок».

Аляксандр Лукашэнка ў сваю чаргу сказаў: «Здаецца, і скакаць пачалі. Тры раўнды перагавораў прайшлі ў Беларусі, пасля ў Стамбуле. А потым Блінкен з Осцінам Зяленскаму каманду далі — той забараніў весці перагаворы. Факты на стале. Факты ў наяўнасці. Таму чаго тут папракаць кагосьці».

«Дэкрэт падпісаў, які забараняе (весці перагаворы з Расіяй. — **Заўв.**)», — пагадзіўся Уладзімір Пуцін.

«Сам сабе забараніў», — пацвердзіў Аляксандр Лукашэнка.

Перспектыва

СТАНОЎЧАЯ ДЫНАМІКА

У ходзе рабочага візіту ў Віцебскую вобласць Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА наведала Віцебск і Гарадок. На парадку дня былі пытанні аховы здароўя і дэмаграфіі, а таксама абмяркоўваўся будучы Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які пройдзе ў Віцебску ў 2024 годзе.

На пасяджэнні Гарадоцкага райвыканкама, у якім узяла ўдзел старшыня верхняй палаты парламента, абмеркавалі пытанні дыспансерызацыі насельніцтва, замацаванасці маладых спецыялістаў на месцах і іншыя. Галоўны ўрач Гарадоцкай цэнтральнай раённай бальніцы Валерый Самсонаў расказаў, што дэмаграфічныя паказчыкі на Гарадоччыне маюць тэндэнцыю да зніжэння, але не з'яўляюцца крытычнымі. Сітуацыя з года ў год паляпшаецца.

Дэмаграфічнае пытанне на Гарадоччыне знаходзіцца ў цэнтры ўвагі. Спецыялісты працуюць з маладымі сем'ямі, будучымі мамамі і клапоцяцца аб іх здароўі і дабрабыце. «Дэмаграфія — гэта не толькі задача сістэмы аховы здароўя, але і сферы адукацыі, сацыяльнай абароны. Гэта таксама пытанні жылля, і гэта тое, што можа замацаваць на месцах моладзь. Нам трэба гэтыя формы выкарыстоўваць і рабіць усё, каб моладзь заставалася на месцах», — адзначыла Наталля Качанава.

Спікер таксама наведала Віцебск, які ў 2024 годзе стане пляцоўкай для правядзення XI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Разам са старшынёй Віцебскага аблвыканкама Аляксандрам Субоціным і кіраўніцтвам вобласці Наталля Іванаўна наведала аб'екты ў горадзе на Дзвіне, якія будуць задзейнічаны. Сярод іх — канцэртная зала «Віцебск», дзе ідуць рамонтныя работы.

Тэму, спікераў, галоўныя пляцоўкі Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі вызначаць на пасяджэнні аргкамітэта, сфарміраванага Саветам Рэспублікі і Саветам Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

У фармаце дыялогу

У Брэсце прайшоў семінар з кадравым рэзервам

У Брэсцкай вобласці эфектыўна працуюць з перспектыўным кадравым рэзервам. Аб гэтым заявіў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА, паведаміла БелТА.

У Брэсце арганізаваны двухдзённы семінар з перспектыўным кадравым рэзервам. У ім удзельнічаюць каля 50 чалавек — гэта студэнты і спецыялісты з усіх гарадоў і раёнаў вобласці, якія працуюць у розных галінах. Ігар Сергеенка адзначыў важнасць такіх сустрэч. Ён заклікаў маладых людзей падыходзіць да работы без фармалізму, будаваць кар'еру, вучачыся кіраваць і пераймаючы вопыт калег. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта звярнуў увагу, што Брэсцкая вобласць эфектыўна працуе са сваім кадравым рэзервам.

Мерапрыемства прайшло ў фармаце дыялогу. Маладыя людзі скарысталіся магчымасцю задаць хвалюючыя пытанні: аб сацыяльнай падтрымцы, маладзёжнай палітыцы і замацаванні маладых спецыялістаў, рабоце педагогаў, службе ў арміі і абароне граніц, аб развіцці сферы высокіх тэхналогій. Асаблівую актыўнасць праявілі студэнты ўніверсітэтаў Брэста, Пінска і Баранавіч.

Ігар Сергеенка падкрэсліў, што трапіць у кадравы рэзерв — гэта толькі першая ступень. «Такая работа дае магчымасць людзям праявіць сябе, пераканацца ў іх здольнасцях узначальваць калектывы, ствараць, тварыць. Сведчаннем эфектыўнасці з'яўляецца тое, што толькі ў бягучым годзе на вышэйшыя пасады ў Брэсцкай вобласці было назначана 11 маладых людзей», — заўважыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Размова са студэнтамі і спецыялістамі закранула і Дзень народнага адзінства. Ігар Сергеенка звярнуў увагу на важнасць даты 17 верасня 1939 года ў гісторыі Беларусі, якая захавалася ў назве вуліц і прадпрыемстваў. У бягучым годзе беларусы будуць адзначаць Дзень народнага адзінства толькі трэці раз. Ёсць перадумовы, што гэта свята зойме сваё месца сярод любімых — Дня Перамогі, Дня Незалежнасці.

У сустрэчы з маладымі людзьмі таксама прынялі ўдзел **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА** і **памочнік Прэзідэнта—інспектар па Брэсцкай вобласці Валерый ВАКУЛЬЧЫК.**

«НЕ ПРОСТА СТАБІЛЬНАСЦЬ, А РАЗВІЦЦЁ»

Кіраўнік урада наведаў Магілёўшчыну

У фокусе ўвагі Прэм'ер-міністра Рамана ГАЛОЎЧАНКІ былі стратэгічна важныя суб'екты эканомікі Магілёўшчыны — рэзідэнты СЭЗ і новая інавацыйная малочнатаварная ферма, якая будуецца па Указе Прэзідэнта № 50. Як падкрэсліў кіраўнік урада, можна купіць шмат механізмаў, машын, але сіла беларусаў — у адзінстве.

— Кожны з нас элемент падмурка адзінства, — удакладніў Раман Галоўчанка. — Вельмі важна захаваць гэты наш беларускі дух, беларускую цярпімасць, наша жаданне да стваральнай працы. Будзе гэта — у нас ніякіх праблем не ўзнікне з адзінствам. Вядома, без працы людзей нічога зрабіць немагчыма. З пункту гледжання эканомікі ўрад робіць усё, каб у нас была не проста стабільнасць, а развіццё. І вынікі гэтага года лічым здавальняльнымі.

Раман Галоўчанка азнаёміўся з работай расійскага прадпрыемства «Омск Карбон Магілёў», якое прапісалася на пляцоўцы СЭЗ «Магілёў». Буйны інвестар з Расіі ТАА «Омскгэхвуглярод» уклаў вялікія сродкі ў стварэнне завода па вытворчасці тэхнічнага вугляроду. Гэта экспартаарыентаванае прадпрыемства, асноўныя спажыўцы яго прадукцыі ў Беларусі — гэта «Белшына», ААТ «Магілёўхімвалакно», «Беларусьгуматэхніка» і «Нафтан-Палімір».

Яшчэ адзін рэзідэнт СЭЗ, якога наведаў Раман Галоўчанка, — ТАА «БелЭмса». Па выніках работы за мінулы год прадпрыемства прызнана найлепшым сярод прамысловых арганізацый Магілёўскага раёна, а яго заснавальнік і дырэктар Учар Тэйіп удастоены ганаровага звання «Чалавек года Магілёўшчыны». З 2011 года прадпрыемства ў якасці рэзідэнта СЭЗ «Магілёў» паспяхова рэалізоўвае праект па вытворчасці сродкаў гігіены для дзяцей і дарослых.

— Лічбы сведчаць самі за сябе, — падсумаваў вынікі пасля наведвання гэтых прадпрыемстваў Раман Галоўчанка. — У рамках Еўразійскага эканамічнага саюза мы дасягнулі таго, што ў рынцыпе няма значэння, у якой краіне ЕАЭС ты размяшчаеш вытворчасць, у цябе свабодны доступ на рынак любой краіны. Дзякуючы гэтаму фактару, нашы свабодныя эканамічныя зоны праявілі сябе вельмі добра. Перавагі СЭЗ добра ўплываюць на эканоміку любога праекта. Дзяржава за свае грошы будуе інфраструктуру, падводзіць электрычнасць. Каля 170 мільёнаў рублёў ужо было накіравана на будаўніцтва інфраструктуры да СЭЗаў, але ёсць дадаткова патрэба ў сродках. Паколькі інтарэс захоўваецца і нават расце. За мінулы год і гэты мы зарэгістравалі больш чым 50 новых рэзідэнтаў СЭЗ, цэлы шэраг знаходзіцца ў працэсе падрыхтоўкі дакументаў. Будзем гэты кірунак развіваць і далей, тым больш што ў нас ёсць экстэрытарыяльнасць, так бы мовіць, калі мы можам для асабліва значных праектаў прымаць рашэнні аб выдзяленні дадатковых участкаў не толькі ў рамках існуючых межаў. Урад накіроўвае высілкі на тое, каб яшчэ больш спрасціць адміністрацыйную работу — знізіць час афармлення дакументаў, парадку выдзялення зямельных участкаў у рамках СЭЗа. Ствараем аазіс для бізнес-асяроддзя, які з'яўляецца больш запатрабаваным. Найлепшыя практыкі будзем імкнуцца распаўсюдзіць на тэрыторыю ўсёй краіны. Гэта накшталт палігона для выпрабаванняў, у тым ліку эксперыментаў з пункту гледжання адміністрацыйных працэдур.

Прадпрыемствы, якія мы наведвалі, літаральна за год у тры разы павялічылі аб'ёмы вытворчасці і ў чатыры разы — аб'ём экспарту. Усё гэта практычна працуе на беларускай сыравіне. Прыклад удалага сімбіёзу, дзе вынік далі прэферэнцыі дзяржавы і адказны падыход інвестараў у рэалізацыі сваіх абавязацельстваў.

Прэм'ер-міністр застаўся задаволены і тэмпамі будаўніцтва малочнага комплексу ААТ «Ці-шоўка». Нагадаем, што ў краіне працягваецца мадэрнізацыя малочнай жывёлагадоўлі на 2023—2024 гады, у сувязі з чым запланавана будаўніцтва новых малочнатаварных комплексаў. У пастанове ўрада вызначаны канкрэтныя сельгаспрадпрыемствы і тыпы жывёлагадоўчых аб'ектаў. Дзякуючы мадэрнізацыі малочнай галіны, колькасць сучасных тэхналагічных малочнатаварных ферм апошнім часам значна павялічылася.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Даслоўна

Аляксандр РУМАК:

«МОЦ НАШАЙ КРАІНЫ — У АДЗІНСТВЕ»

Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр Румак расказаў карэспандэнту «Звязды», як жывуць у нашай краіне прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў і чым блізкая для іх Беларусь.

Фота БелТА.

— У Беларусі, па даных перапісу 2019 года, жывуць прадстаўнікі 156 нацыянальнасцяў. Самыя вялікія па колькасці, акрамя беларусаў, рускія, а таксама палякі, украінцы і яўрэі. Гэтыя нацыі традыцыйна жывуць на беларускай зямлі.

— Як жывецца прадстаўнікам іншых нацыянальнасцяў на нашай зямлі?

— Моц нашай краіны — у адзінстве ўсіх нацыянальнасцяў, усіх канфесій, якія жывуць тут, у згодзе, не адчуваючы канфлікташ ці сутыкненняў. Вельмі важна, што кіраўніцтва краіны, усе галіны ўлады разумеюць, што неабходна, каб гэтыя мір і згода захоўваліся. У нас заканадаўча замацавана роўнасць усіх людзей незалежна ад нацыянальнасці, канфесійнай прыналежнасці. Вядома, падобныя законы ёсць ва ўсіх краінах, але забяспечыць на практыцы іх выкананне, добрыя адносіны паміж людзьмі не ўсюды ўдаецца. Прэзідэнт нашай краіны, і ўрад, і мясцовыя органы ўлады праводзяць палітыку на аб'яднанне ўсіх людзей.

Традыцыі беларускага народа — гэта міралюбства, добрасуседства, павага да прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў. Пры гэтым культура людзей іншых нацыянальнасцяў узбагачае культуру беларускага народа. Сведчаннем гэтага з'яўляецца Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур, які праходзіць раз у два гады ў Гродне. Яго чарговае адкрыццё было ў мінулую суботу ў рамках Дня горада Мінска. Гэта першы этап, затым пройдуць адборачныя этапы ў абласцях, дзе вызначацца калектывы, якія выступяць у Гродне.

Дзяржава актыўна аказвае дапамогу ў падтрымцы культурных традыцый прадстаўнікам розных нацыянальнасцяў. На гэта выдаткоўваюцца сродкі з бюджэту. Яркія нацыянальныя касцюмы, якія неабходны для ўдзелу ў розных мерапрыемствах, набываюцца за кошт бюджэтных грошай, што размяркоўваюцца згодна з заяўкамі. Таксама аказваецца дапамога ў выданні розных буклетаў і брашур, якія дэманструюць, як жывуць у нашай краіне людзі той ці іншай нацыянальнасці.

— Нядаўна прадстаўнікі нацыянальных аб'яднанняў пабывалі на экскурсіі ў Палацы Незалежнасці...

— Вельмі хацелася арганізаваць такое мерапрыемства, каб паказаць яшчэ раз, людзі якіх нацыянальнасцяў жывуць у краіне, а яны, у сваю чаргу, вельмі хацелі ўбачыць Палац Незалежнасці, сімвал нашай дзяржаўнасці, дзе выпрацоўваецца палітыка міру і стварэння, якая дазваляе рэалізаваць сябе прафесійна, творча, ствараць сем'і, выхоўваць дзяцей. Мне здаецца, гэта яркае пацвярджэнне напярэдадні Дня народнага адзінства таго, што сіла беларускага народа ў адзінстве, непарыўнасці традыцый, культуры, каштоўнасцяў.

— Цяпер мы з'яўляемся сведкамі супрацьстаяння паміж Польшчай, краінамі Балтыі і нашай краінай. Як у Беларусі адчуваюць сябе палякі, якіх у нашай краіне жыве нямала?

— Гэта найперш палітычныя супярэчнасці, выкліканыя агрэсіўнымі дзеяннямі кіраўніцтва Польшчы і краін Балтыі. А палякі, паўтаруся, трэцяя па колькасці нацыянальнасць у нашай краіне. Яны стагоддзямі жывуць на нашай зямлі і прадстаўлены ва ўсіх органах улады, на самых высокіх пасадах: гэта і міністры, і дэпутаты, і кіраўнікі мясцовых органаў улады. Нацыянальнай прыкметы не існуе пры выбранні ці прызначэнні на тую ці іншую пасаду.

Наша дзяржава заўсёды паказвала прыклад талерантных адносін. Гэта і ўсім вядомы бязвіз, які дае магчымасць прыязджаць да нас жыхарам суседніх дзяржаў. Прэзідэнт неаднойчы казаў, што суседзяў не выбіраюць, яны ад Бога, і людзі спакойна ехалі і едуць у Беларусь.

Безумоўна, нашы людзі адчуваюць пэўны дыскамфорт з-за абмежаванняў, якія ўводзяцца з закрыццём прыгранічных пунктаў пропуску, тым больш што шмат сваякоў і блізкіх жыве ў суседніх краінах. Але сваім адкрытым добрасуседскім стаўленнем мы паказваем жыхарам Польшчы і краін Балтыі, што можа быць і іншая палітыка ў адносінах да сваіх суседзяў. Я ўпэўнены, што гэтыя супярэчнасці, якія ёсць цяпер, будуць пераадолены, а добрасуседскія кантакты паміж простымі людзьмі застануцца назаўсёды.

Алена КРАВЕЦ.

Акцыя

У шэрагу сцягоў

Акцыя «Сімвал адзінства» прайшла ў Баранавічах. Удзельнікі аўтапрабегу пад эгідай рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Патрыёты Беларусі» сустрэліся з грамадскасцю горада на тэрыторыі сярэдняй школы № 1 г. Баранавічы імя С. І. Грыцаўца.

На ўрачыстае мерапрыемства прыйшлі вучні прававых класаў, класа Міру, выхаванцы ваенна-патрыятычных клубаў горада, кадэцкага вучылішча, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў, кіраўнікі гар- і райвыканкамаў вобласці. Месца для ўрачыстасці выбрана невыпадкова. Школа № 1 самая вялікая ў горадзе і самая маладая. І першы ў краіне Музей народнага адзінства быў адкрыты менавіта тут. Удзельнікі аўтапрабегу наведалі названы музей.

Як і ва ўсіх папярэдніх мерапрыемствах, што прайшлі па абласцях краіны, удзельнікам акцыі «Сімвал адзінства» перадалі сцягі рэгіёнаў для размяшчэння іх на алеі сцягоў у сталіцы. Сцяг Брэсцкай вобласці старшыні РГА «Патрыёты Беларусі» Мікалаю Зарубіцкаму перадаў старшыня Брэсцкага абласнога Савета Юрый Наркевіч. Затым былі перададзены сцягі ўсіх раёнаў вобласці.

Яна СВЕТАВА.
Фота Баранавіцкага гарвыканкама.

Добрая навіна

У СТАЛІЧНЫМ МІКРАРАЁНЕ СОКАЛ АДКРЫЛІ ДЗІЦЯЧЫ САДОК І МЕДЫЦЫНСКУЮ АМБУЛАТОРЫЮ

У сталічным мікрараёне Сокал напярэдадні Дня народнага адзінства адкрылі два сацыяльныя аб'екты — дзіцячы садок і медыцынскую амбулаторыю.

Трохпавярховы будынак дзіцячага садка мае ўсе сучасныя віды інжынернага забеспячэння і адпавядае патрабаванням экалагічных, санітарна-гігіенічных, супрацьпажарных стандартаў. Тут створаны ўмовы для размяшчэння дзвюх ясельных груп па 15 дзяцей і дзесяці дашкольных груп па 20 дзяцей.

Старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ падкрэсліў неабходнасць уводзімага аб'екта, бо ўсё больш маладых сем'яў выбіраюць месцам для жыцця сталічны мікрараён Сокал. «Вельмі прыемна, што напярэдадні Дня народнага адзінства ў Сокале адкрываецца дзіцячы садок. Маладыя сем'і актыўна селяцца тут, іх дзеці павінны быць у добрых руках», — адзначыў старшыня Мінгарвыканкама.

Міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ, у сваю чаргу, звярнуў увагу на тое, што дзяржавай створаны ўсе ўмовы для выканання неабходных сацыяльных гарантый у поўным аб'ёме.

Яшчэ адным падарункам горада жыхарам сталічнага мікрараёна Сокал стала з'яўленне сучаснага аддзялення паліклінікі. Новую ўстанову аховы здароўя размясцілі на першым паверсе шматкватэрнага жылога дома. Аддзяленне разлічана на 100 наведванняў у змену. Новая ўстанова аховы здароўя забяспечыць магчымасць даступнай медыцынскай і кансультацыйнай дапамогі неўролага, афтальмолага, оталарынголага, эндакрынолага, гінеколага, хірурга і стаматолага. Звяртацца сюды можна і па дапамогу ў вырашэнні экспертных пытанняў: па прадаўжэнне лісткоў непрацаздольнасці, па накіраванне для ўстанаўлення інваліднасці, па экспертызу на ўзроўні ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі, кантроль якасці аказання медыцынскай дапамогі.

Міністр аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ пасля агляду новага філіяла раённай паліклінікі адзначыў яго замкнёны цыкл і шматфункцыянальнасць і канстатаваў, што жыхары мікрараёна з гэтага часу змогуць атрымліваць поўны спектр медыцынскіх паслуг на месцы, без неабходнасці наведваць сталічныя бальніцы. «Развіццё першаснага медыцынскага звяна ў рэгіёнах — адказ на запыт аб сацыяльнай справядлівасці», — падкрэсліў ён.

«Няма нічога даражэйшага, чым жыццё і здароўе людзей. Я думаю, што тут рукамі медыкаў будуць створаны ўсе ўмовы, каб чалавек атрымаў неабходную кваліфікаваную дапамогу. Мы, у сваю чаргу, зрабілі ўсё, каб сюды было пастаўлена неабходнае найноўшае абсталяванне, якое дазволіць аказваць шырокі спектр медпаслуг. Але самае галоўнае тут — людзі, якія клапатліва ставяцца да сваіх пацыентаў», — падкрэсліў на цырымоніі адкрыцця Уладзімір Кухараў.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Варшаве прайшоў шматтысячны «марш гневу»

У польскай сталіцы бюджэтнікі выйшлі на «марш гневу» супраць канцылярыі прэм'ер-міністра з патрабаваннем павышэння заробкаў, паведаміла радыё RMF 24. Паводле даных арганізатараў маніфестацыі, у ёй узялі ўдзел тысячы чалавек. Сярод іх — супрацоўнікі пракуратуры, судоў, упраўлення сацыяльнага страхавання, паліцыі, устаноў культуры, пажарныя і настаўнікі. «Дзяржава без нас функцыянаваць не будзе, але яна нам недаплачвае», — заяўляюць пратэстоўцы. Многія таксама скандзіравалі: «Чыноўнік — не раб». На думку маніфестантаў, урад адносіцца да чыноўнікаў як да таннай рабочай сілы. «Марш — гэта крык адчаю. Хопіць жыць у галечы!» — заявіў адзін з пратэстуючых прадстаўнікоў МУС рэспублікі, словы якога прыводзіць Gazeta Wyborcza. «Мы папярэджвалі, што аднойчы на вуліцах Варшавы з'явяцца людзі, якія жадаюць асноватворнага права на годнасць і павагу. Спадзяюся, уся Польшча зразумее, што эканомія на бюджэце — гэта эканомія на кожным паляку», — адзначыла старшыня форуму прафсаюзаў Польшчы Дарота Гардыяс.

Будаўнічая галіна Германіі перажывае крызіс

Прэзідэнт Нямецкай канфедэрацыі кваліфікаваных рамёстваў Ёрг Дзітрых папярэдзіў аб калапсе ў будаўнічай галіне Германіі, піша Das Erste. Ён заявіў, што сектар «на вялікай хуткасці рухаецца ў сцяну». Паводле слоў Дзітрыха, будаўнічая галіна з'яўляецца ключавым сектарам для кваліфікаваных рабочых, у якім працуюць звыш 2,3 мільёна чалавек. «І зараз гэтаму сектару пагражае поўны крах», — сказаў кіраўнік канфедэрацыі. Праекты, рашэнне па якіх было прынята, уключаючы фінансаванне, некалькі гадоў таму, усё яшчэ знаходзяцца ў стадыі рэалізацыі. Пры гэтым фінансаванне будучых праектаў рэзка скарацілася. «Калі палітыкі не прымуць контрзахадаў, гэта адаб'ецца на скарачэнні магутнасцяў», — рэзюмаваў Дзітрых. Ён заклікае федэральны ўрад прыняць меры. Як паведаміла РІА «Навіны», раней канцлер Германіі Олаф Шольц заявіў, што эканоміка краіны перажывае складаныя часы, асабліва з-за сваёй залежнасці ад экспарту. Ён нагадаў, што Берлін і так павялічыў дзяржаўны доўг на сотні мільярдаў еўра за апошнія гады, каб справіцца з пандэміяй і змякчыць наступствы антырасійскіх санкцый.

Байдэну-малодшаму пагражае да 25 гадоў турмы

Паводле судовага дакумента, сын прэзідэнта ЗША Джо Байдэна Хантэр абвінавачваецца ў незаконным набыцці, а таксама захоўванні зброі. Паведамляецца, што ў Дэлавэры журы прысяжных узгадніла абвінавачванне па трох пунктах. Удакладняецца, што два з іх звязаны з прадастаўленнем ілжывай інфармацыі Байдэнам-малодшым пры куплі пісталета «Кольт». Тады Хантэр адмаўляў ужыванне наркотыкаў. Трэці пункт датычыцца інфармацыі аб захоўванні зброі ў перыяд ужывання наркатычных рэчываў. Байдэн-малодшы стаў першым у гісторыі дзіцем дзеючага прэзідэнта Злучаных Штатаў, супраць якога вылучылі абвінавачванні, што ўтрымліваюць два эпізоды «наўмыснай нявыплаты падаткаў».

БЯДУ МОЖНА ПАПЯРЭДЗІЦЬ

Карэспандэнты «Звязды» адправіліся ў рэйд з участковым

Нягледзячы на эфектыўнасць намаганняў Міністэрства ўнутраных спраў па папярэджанні злачынстваў супраць жыцця і здароўя грамадзян, гэтая праблема застаецца актуальнай. Пасля ўжывання алкаголю людзі высвятляюць паміж сабой адносіны, канфліктуюць, у выніку чаго нярэдка не абыходзіцца без ахвяр. Асаблівую заклапочанасць супрацоўнікаў міліцыі выклікаюць выпадкі, калі ад рук блізкіх церпяць жанчыны, дзеці, пажылыя людзі.

Тыя грамадзяне, якія злоўжываюць алкаголем, у першую чаргу беспрацоўныя, знаходзяцца на прафілактычным уліку ў органах унутраных спраў. Нешчаслівыя сем'і, дзе выхоўваюцца непаўналетнія або пражываюць пажылыя людзі, — на асаблівым кантролі міліцыянераў. У полі зроку людзей у пагонах — і асобы, на якіх сістэматычна скардзяцца суседзі.

На што супрацоўнікі органаў унутраных спраў звяртаюць увагу падчас наведвання падуліковых, якую работу з імі праводзяць, а самае галоўнае, ці ёсць у прафілактычных мерапрыемствах эфект, на прыкладзе аднаго тэрытарыяльнага ўчастка высвятлялі карэспандэнты «Звязды».

НЕ АДЧЫНЯЮЦЬ? ЗВЯРТАЕМСЯ ДА СУСЕДЗЯЎ

Участковы інспектар Савецкага РУУС г. Мінска Андрэй Пікта заступае на службу ў 15.00. Першнаперш — інструктаж у будынку раённага ўпраўлення. Міліцыянеры ўзбройваюцца, атрымліваюць установу на будучую змену, заслухоўваюць аператыўную абстаноўку, знаёмяцца з матэрыяламі, на якіх патрэбна сканцэнтраваць увагу. Яны добра ведаюць, хто на цяперашні момант знаходзіцца ў вышуку. Атрымаўшы задачы, участковыя інспектары накіроўваюцца ў апорныя пункты аховы правапарадку — менавіта там іх працоўныя месцы. Аднак у кабінетах міліцыянеры не затрымліваюцца. «Узброіўшыся» патрэбнай інфармацыяй і дакументацыяй, накіроўваюцца па пэўных адрасах, якія патрабуюць праверкі або рэагавання.

Па маршруце разам з Андрэем Піктам адпраўляемся і мы. У планах на сёння — наведаць кватэры, гаспадары якіх стаяць на прафілактычным уліку ў органах унутраных спраў. На кантролі міліцыянераў грамадзяне знаходзяцца па прычыне злоўжывання алкагольнымі напоямі, а адпаведна — вядзення асацыяльнага ладу жыцця.

Адна з падапечных участковага інспектара міліцыі жыве на завулку Горным. Андрэй Пікта набірае нумар кватэры на дамафоне — на тым канцы сувязі не адказваюць. Міліцыянер праяўляе настойлівасць, але безвынікова.

— Калі грамадзяне не адчыняюць нам дзверы, маем права патэлефанаваць суседзям, — тлумачыць участковы. Там адказваюць — і мы бесперашкодна трапляем у пад'езд.

Пакуль падымаемся на паверх, супрацоўнік расказвае, што гаспадыня жылля пражывае адна. Яна на пенсіі, злоўжывае алкаголем. Аб гэтым стала вядома, калі суседзі паскардзіліся на жанчыну ў органы ўнутраных спраў: яны былі занепакоены тым, што з кватэры сыходзяць падазроныя гукі, пахі, нярэдка туды прыходзяць асобы, якія не выклікаюць даверу.

Участковы цісне на кнопку званка — адчыняць дзверы нам ніхто не збіраецца. Бесперапынна брэша сабака. Іншых гукаў за дзвярыма не чуваць — або гаспадыні ў кватэры няма, або яна наўмысна не адчыняе. Андрэй Валер'евіч націскае кнопку званка суседзяў. «Трэба даведацца, можа, з падапечнай нешта здарылася, можа, яна ў бальніцы», — тлумачыць ён.

У гэтым выпадку чакаць не давялося. У парозе з'яўляецца жанчына пенсіённага ўзросту.

— Добры дзень! Калі вы бачылі вашу суседку апошні раз? — пытаецца міліцыянер.

— Не так даўно, — адказвае яна і ўдакладняе дэталі: — Яе сабака нагадзіў, я зрабіла заўвагу і папрасіла прыбраць, на што суседка пачала са мной сварыцца і катэгарычна адмовілася навесці парадак за сваім гадаванцам. А яшчэ яна па-ранейшаму злоўжывае спіртным.

Супрацоўнік міліцыі абавязкова знойдзе падуліковую.

«Асноўная небяспека такіх кватэр у тым, што іх гаспадары водзяць туды іншых людзей, з якімі разам распіваюць алкаголь, нярэдка на фоне ап'янення здараюцца канфлікты і даходзіць да злачынства. Наша задача — папярэдзіць развіццё падобнай падзеі, прадухіліць трагедыю, — тлумачыць асноўную мэту прафілактычнай работы Андрэй Валер'евіч. — Як правіла, прафілактычны ўлік спрыяльна ўплывае на людзей. Яны не парушаюць заканадаўства, спраўна выконваюць рэкамендацыі міліцыянераў. Калі чалавек выпраўляецца, яго здымаюць з уліку. Калі не — ёсць падстава для накіравання такога

грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый».

ПРЫВЕСЦІ Ў ПАРАДАК І СЯБЕ, І ЎЛАСНАЕ ЖЫЛЛЁ

Пакуль далей ідзём па маршруце, заўважаем, што, перш чым пазваніць у папярэднюю кватэру, міліцыянер уключыў відэарэгістратар. Гэты атрыбут з'яўляецца неад'емнай часткай сучаснай экіпіроўкі супрацоўніка органаў унутраных спраў. Участковым увогуле без іх не абысціся. Не ўсе падуліковыя паводзяць сябе адэкватна, нярэдка ўступаюць з міліцыянерам у канфлікт.

«Калі канфліктная сітуацыя здараецца, праглядаем відэарэгістратар і разбіраемся, як усё было на самай справе. Акрамя таго, гэтае ўстройства выконвае функцыю дакументавання правапарушэнняў, злачынстваў, што з'яўляецца важкім аргументам у судзе. Адным словам, відэарэгістратар — гэта наш памочнік, сведка», — удакладняе ўчастковы інспектар.

Тым часам падыходзім да дома па вуліцы Гікалы. У кватэры, у якую тэлефануе ўчастковы, жыве мужчына са сваёй сужыцелькай. Яны выпіваюць. Сігнал у міліцыю паступіў таксама ад суседзяў.

Дзверы адчыняюцца. У парозе стаіць жанчына сярэдніх гадоў.

— Уладзімір Барысавіч дома? — пытаецца лейтэнант міліцыі.

— Дома, — адказвае тая і дазваляе прайсці ў памяшканне. Там знаходзіцца і гаспадар.

— Вось ужо трэці месяц на бальнічным, — скардзіцца мужчына і паказвае на загіпсаваную нагу.

Участковы аглядае жылое памяшканне на прадмет прысутнасці старонніх грамадзян, пэўных падазроных прадметаў, звяртае ўвагу на антысанітарны стан жылля. Міліцыянер удакладняе ў мужчыны, ці ўжывае ён апошнім часам алкаголь, пытаецца, калі нарэшце навядзе ў кватэры парадак, — жыллё даўно патрабуе прыборкі, пра рамонт нават не ідзе размовы. Гаспадар запэўнівае, што на выпіўку няма ні грошай, ні здароўя. Каментуючы беспарадак у жыллі, абяцае ўсё выправіць, як толькі паправіцца. Андрэй Пікта праводзіць гутарку аб супрацьзаконных дзеяннях, абяцае, што прыйдзе ў наступным месяцы, — парадак да гэтага часу павінен быць наведзены.

«У выпадку парушэння санітарнага стану ў жылых і дапаможных памяшканнях, невыканання патрабаванняў заканадаўства мы збіраем матэрыялы і накіроўваем іх у адміністрацыю Савецкага раёна для правядзення праверкі», — заўважае ўчастковы інспектар.

Выйшаўшы з пад'езда, назіраем на лаўцы жанчыну. Участковы яе добра ведае: вітаецца і нават называе па імені, імені па бацьку. Карыстаючыся момантам, удакладняе, як характарызуецца мужчына, якога мы толькі што наведалі. «Магчыма, і выпівае, але ціха, не скандаліць — адным словам, скаргаў у яго адрас няма», — кажа пенсіянерка.

ПСІХІЧНАЕ РАССТРОЙСТВА — НАГОДА ДЛЯ ПРАВЕРКІ

Пакуль ідзём па наступным адрасе, супрацоўнік органаў унутраных спраў дзеліцца сваімі назіраннямі.

Па яго словах, асацыяльны лад жыцця, як правіла, вядуць беспрацоўныя грамадзяне. Прычым любой узроставай катэгорыі. Ёсць нават маладыя людзі, якія па пэўнай прычыне не працаўладкаваны, ужываюць працяглы час спіртныя напоі. Не сочаць ні за сабой, ні за жылым памяшканнем. Нярэдка ў іх утвараюцца вялікія запазычанасці за камунальныя паслугі. Такія грамадзяне часта парушаюць грамадскі парадак. Кожны ўчастковы ведае жыхароў свайго ўчастка, а таму трымае гэтую катэгорыю ў полі зроку.

«Цяпер мы наведаем кватэру, якая стаіць на ўліку ў органах унутраных спраў з-за захламлення, — расказвае пра асаблівасці наступнага адраса ўчастковы інспектар. — Там жыве пенсіянер, у якога дыягнаставана псіхічнае расстройства. Ён заставіў жыллё кнігамі, якія стаяць стосамі ад падлогі да столі. Іх так шмат, што жыць у памяшканні немагчыма. Акрамя таго, нямала там і іншых рэчаў, якія мужчына цягне са сметніц».

На званок у дзверы падуліковы не адказвае. Міліцыянер мяркуе, што той можа знаходзіцца ў бальніцы, куды яго рэгулярна адпраўляюць сваякі на лячэнне. Удакладніць інфармацыю вырашае ў суседзяў.

— Даўно бачылі Уладзіслава Пятровіча? — пытаецца ў жанчыны, якая адчыніла дзверы.

— Не чуваць, не відаць, можа, з тыдзень, — кажа яна.

— Падазроныя гукі з кватэры не сыходзяць? Можа, хтосьці сюды наведваецца? — удакладняе супрацоўнік.

— Не, ніхто туды не ходзіць — цішыня.

Падзякаваўшы за размову, Андрэй Пікта выходзіць з пад'езда. Следам за ім — і мы. «Будзем удакладняць месцазнаходжанне мужчыны, у найбліжэйшы час звяжамся з яго сваякамі», — расказвае ён пра далейшыя дзеянні.

Заўважаем на лавачцы дзядулю: ці то спіць, ці то яму дрэнна — яго стан і ў міліцыянера, і ў журналістаў выклікае сумненне. Андрэй Валер'евіч падыходзіць да пенсіянера, пытаецца, як ён сябе адчувае. Дзядуля не дачувае, перапытвае, узнімаецца, спрабуе некуды ісці, зноў вяртаецца да нас — па ўсім відаць, згубіўся. Участковы ўдакладняе, як яго завуць, па якім адрасе пражывае. Неабходную інфармацыю ўдаецца даведацца толькі з пятай ці шостай спробы. У выніку Андрэй Пікта прымае рашэнне суправадзіць дзядулю дадому, мы падключаемся. Убачыўшы знаёмы двор, свой пад'езд, пенсіянер дзякуе міліцыянеру за дапамогу і жадае добрай службы.

Працоўны дзень у інспектара не завяршаецца. А служба ўвогуле не мае часавых абмежаванняў. Аднак менавіта аб такой прафесіі Андрэй Пікта і марыў. У міліцыю прыйшоў адразу пасля заканчэння ВНУ. Спачатку служыў у Дэпартаменце аховы, але імкнуўся быць участковым інспектарам — у гэтай дзейнасці, па яго словах, больш зносін з людзьмі. Менавіта такога Андрэй і хацеў. А яшчэ ён марыць атрымаць юрыдычную адукацыю — невыпадкова сумяшчае службу з навучаннем у Акадэміі МУС. Жадаем супрацоўніку міліцыі дасягнення пастаўленых мэт і павышэння па службе. Днямі, дарэчы, стала вядома, што Андрэю Пікту прысвоена чарговае званне — старшага лейтэнанта міліцыі. З чым і віншуем!

Вераніка КАНЮТА.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Па этычных перакананнях імёны герояў публікацыі (акрамя супрацоўніка міліцыі) зменены.

Ноу-хау

ПОРУЧ З ВЫСОКІМІ ТЭХНАЛОГІЯМІ

Дэпартамент аховы актыўна прымяняе ў сваёй дзейнасці сучасныя распрацоўкі

Міліцэйскае ведамства пастаянна ўдасканальваецца, упэўнена крочыць у нагу з высокімі тэхналогіямі, якія ўкараняюцца ў работу ўсіх падраздзяленняў. Новымі, перадавымі сістэмамі «ўзбройваецца» і Дэпартамент аховы. Невыпадкова 2023 год у гэтым падраздзяленні МУС аб'яўлены Годам інфармацыйных тэхналогій.

Для таго каб азнаёміцца з ноу-хау, якімі карыстаюцца супрацоўнікі органаў унутраных спраў, карэспандэнты «Звязды» наведалі аператыўна-дзяжурную службу Мінскага гарадскога ўпраўлення Дэпартамента аховы МУС.

АПЕРАТЫЎНАСЦЬ ВЫРАШАЕ МНОГАЕ

Адна з апошніх навінак, якой актыўна карыстаюцца супрацоўнікі Дэпартамента аховы, — аўтаматызаванае працоўнае месца ўпраўлення. На вялікім экране адлюстравана карта Мінска. Значкамі сіняга колеру на ёй пазначаны шлагбаумы або замкі ў пад'ездаў жыллёвых комплексаў сталіцы. Дзякуючы гэтай праграме дзяжурны без дадатковых маніпуляцый можа дыстанцыйна іх адчыніць. Гэта дазваляе міліцыянерам больш аператыўна прыбыць да кватэры, у якой спрацавала сігналізацыя.

— Акрамя таго, з дапамогай праграмнага забеспячэння «Рэвізор ВМС Кліент» мы можам назіраць відэавыяву, якая выводзіцца з камер, устаноўленых на канкрэтным жыллёвым комплексе, — расказвае **намеснік начальніка аддзела сродкаў і сістэм аховы Мінскага гарадскога ўпраўлення Дэпартамента аховы МУС падпалкоўнік міліцыі Аляксандр ЕРМАКОЎ**. — Пакуль нашы супрацоўнікі прыбываюць да памяшкання, у якім спрацавала сігналізацыя, дзяжурны ў гэты час адсочвае ўсю сітуацыю: бачыць тое, што адбываецца на прылеглай тэрыторыі, каля ўвахода



ў пад'езд, праглядаецца і абстаноўка ў холе, ліфце.

ШКОЛЫ — ПАД КАНТРОЛЕМ

У кожнай установе сярэдняй адукацыі нясе службу вартаўнічая або міліцэйская ахова дэпартамента. Аднак назіраць за тым, што адбываецца ў той ці іншай школе, можна і ў аператыўна-дзяжурнай службе па сродках аддаленага доступу да сістэм відэаназірання, устаноўленых у навучальных установах. Калі ў канкрэтнай школе спрацавала трывожная сігналізацыя, туды выбывае нарад. Пакуль ён знаходзіцца ў дарозе, дзяжурны адсочвае сітуацыю ў рэжыме рэальнага часу і інфармуе калег аб абставінах здарэння, пры неабходнасці адпраўляе для дапамогі яшчэ адну групу затрымання.

— Сістэма відэаназірання дазваляе маніторыць сітуацыю не толькі ў рэжыме рэальнага часу, але і праглядаць тое, што было зафіксавана раней, — тлумачыць **старшы інспектар-дзяжурны аператыўна-дзяжурнай службы Мінскага гарадскога ўпраўлення Дэпартамента аховы МУС маёр міліцыі Сяргей ЖУДРО**. — Архіў відэазапісу, які вядзе сістэма, дапамагае падчас высвятлення абставін здарэння. Акрамя таго, распрацоўка дазваляе назіраць, праспектах, каля адміністрацыйных будынкаў, буйных гандлёвых цэнтраў, месцах адпачынку і інш.

— Выявы з гэтых відэакамер выводзяцца на наш манітор, — расказвае **малодшы інспектар-дзяжурны аператыўна-дзяжурнай службы Мінскага гарадскога ўпраўлення Дэпартамента аховы МУС Дзмітрый РАМАНЧЫК**. — Гэта дазваляе нам маніторыць сітуацыю ў рэжыме рэальнага часу, дапускаецца архіўны прагляд. Сістэма дапамагае супрацоўнікам органаў унутраных спраў выяўляць асобу, якая здзейсніла злачынства. У базу ўносіцца фотаздымак грамадзяніна, які знаходзіцца ў вышуку. Як толькі гэты чалавек трапляе ў зону дзейнічання відэакамер, дзяжурны атрымлівае паведамленне, па

каб прадстаўнікі вартаўнічай аховы не спалі, добрасумленна выконвалі свае абавязкі.

АД КАМЕРЫ НЕ СХАВАЕШСЯ

Прадстаўнікі аператыўна-дзяжурнай службы Мінскага гарадскога ўпраўлення Дэпартамента аховы МУС у сваёй дзейнасці карыстаюцца Рэспубліканскай сістэмай маніторынгу грамадскай бяспекі. Кажучы прасцей, гэта сістэмы відэаназірання, якія ўстаноўлены ў гарадах нашай краіны. Як правіла, камеры фіксуюць тое, што адбываецца ў месцах масавага знаходжання грамадзян: у метро, на цэнтральных вуліцах і якім адрасе ў дадзены момант часу з'явілася падобная да падазронай асоба. Туды выбывае група затрымання і адпрацоўвае мерапрыемствы па пошуку злачынцы.

СТАРОННІМ УВАХОД ЗАБАРОНЕНЫ!

На тэрыторыі Мінскага гарадскога ўпраўлення Дэпартамента аховы МУС функцыянуе інтэлектуальная сістэма відэаназірання. Камеры, устаноўленыя па перыметры адміністрацыйнага будынка, забяспечваюць прагляд усёй тэрыторыі, распазнаюць, дзе рухаецца чалавек, а дзе — транспартны сродак. На жывёл і птушак сістэма не рэагуе. Варта чалавеку падысці нават да плота міліцэйскага падраздзялення, спрацоўвае аўдыясігнал — і дзяжурны высвятляе, ці выпадковы гэта прахожы, ці нехта наўмысна спрабуе трапіць у будынак.

Такія сістэмы ўстаноўлены ва ўсіх падраздзяленнях Мінскага гарадскога ўпраўлення Дэпартамента аховы. Перш за усё гэта звязана з гарантаваннем бяспекі на ведамасных аб'ектах.

АД ІНСТРУКТАЖУ ДА ПОШУКУ

Аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма «Ахова» з'яўляецца распрацоўкай Дэпартамента аховы. Тэхналагічная навінка праходзіць доследную эксплуатацыю і ў студзені будучага года будзе ўкаранёна ва ўсе падраздзяленні краіны. У яе ўносіцца інфармацыя па сутачнай зводцы, арыенціроўкі па злачынцах, зніклых без вестак, скрадзеным аўтатранспарце — усё гэта паскарае прыняцце рашэнняў і ўплывае на эфектыўнасць вышуковай работы. У сістэме адлюстраваны прынятыя пад ахову адміністрацыйныя аб'екты, а таксама кватэры, дамы фізічных асоб. З дапамогай гэтай распрацоўкі праводзіцца інструктаж асабовага складу, міліцыянераўкіроўцаў перад заступленнем на службу правяраюць на веды Правілаў дарожнага руху. Дзяжурныя, заступаючы на змену, праглядваюць відэаматэрыялы, знятыя на індывідуальныя відэарэгістратары супрацоўнікаў міліцыі.

Як рэзюмуе **начальнік Мінскага гарадскога ўпраўлення Дэпартамента аховы палкоўнік міліцыі Дзмітрый ВАСКОЎСКІ**, аб'яўлены ў Дэпартаменце аховы год інфармацыйных тэхналогій абумовіў вектар развіцця гэтых падраздзяленняў. «Усе тыя тэхнічныя новаўвядзенні і распрацоўкі, якія мы выкарыстоўваем у нашай працы, служаць для таго, каб забяспечыць камфорт і бяспеку нашых заказчыкаў, а таксама стварыць камфортныя ўмовы для службы нашых супрацоўнікаў, — падкрэсліў ён.

Вераніка КАНЮТА.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Будзьце пільнымі!

ПАВЕДАМІЦЕ АБ НАЯЎНАСЦІ ЗАМЕЖНЫХ ДАКУМЕНТАЎ

Міністэрства ўнутраных спраў нагадвае, што 11 ліпеня 2023 года ўступілі ў сілу змяненні і дапаўненні ў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь». Дакументам устаноўлены абавязак грамадзян Беларусі ў трохмесячны тэрмін паведаміць аб наяўнасці (набыцці) грамадзянства (падданства), віду на жыхарства або іншага дакумента замежнай дзяржавы, які дае права на льготы і іншыя перавагі ў сувязі з палітычнымі, рэлігійнымі поглядамі або нацыянальнай прыналежнасцю.

Зрабіць гэта можна адным з наступных спосабаў:

— праз размяшчэнне адпаведнай інфармацыі на адзіным партале электронных паслуг агульнадзяржаўнай аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы — platform.gov.by. Папярэдне неабходна атрымаць электронны лічбавы подпіс і стварыць асабісты кабінет на дадзеным партале;

— непасрэдна звярнуўшыся ў орган унутраных спраў або дыпламатычнай службы па месцы свайго знаходжання;

— праз адзіную рэспубліканскую інфармацыйную сістэму ўліку і апрацоўкі звароткаў грамадзян і юрыдычных асоб (обращение.бел);

— накіраваўшы пісьмовы зварот у орган унутраных спраў або дыпламатычнай службы.

Інфармаванне аб наяўнасці замежнага дакумента ажыццяўляецца любым з пералічаных спосабаў шляхам прадстаўлення запоўненага бланка паведамлення з дадаткам копіі замежнага дакумента.

На сайце МУС у падраздзеле «Грамадзянства» раздзела «Формы заяў. Бланкі і ўзоры заяў» размешчаны формы апавяшчэння на рускай і беларускай мовах (запаўняецца на адной з іх па выбары).

Грамадзяне актыўна заяўляюць аб сваіх замежных дакументах. У органы ўнутраных спраў і органы дыпламатычнай службы ўжо звярнуліся больш за 6,5 тысячы чалавек.

Дарэчы, у міліцэйскім ведамстве валодаюць інфармацыяй аб людзях, якія маюць замежнае грамадзянства або від на жыхарства. Таму ў выпадку наяўнасці вышэйназваных дакументаў рэкамендуецца паведаміць аб гэтым самастойна, каб пазбегнуць далейшай адказнасці, увядзенне якой цяпер прапрацоўваецца.

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ
юридическая компания

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

Организатор публичных торгов (аукциона)	**ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by**
Ранее опубликованное извещение о проведении электронных торгов (аукциона)	**Извещение о проведении публичных электронных торгов опубликовано 15.08.2023 в газете «Звязда» № 156 (30036), стр. 6**
Продавец	**ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29**

Предмет публичных торгов (аукциона)

Лот №	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Минимальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.
1	**Автомобиль Nissan Qashqai 2019 года выпуска, черного цвета, номер кузова Z8NFBNJ11ES088379**	63 600,00	38 160,00

Задаток 5 % от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа **– ООО «Индустрия Инноваций»**

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота либо цены за лот, складывающейся в ходе торгов.
В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками торгов

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной площадки ООО «Индустрия Инноваций» https://iintorgi.by

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета торгов (аукциона): 10 (десять) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи

Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресам: https://iintorgi.by

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **1 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

Дата и время проведения торгов (аукциона): 29.09.2023 начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Торги проводятся на электронной торговой площадке https://iintorgi.by

Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в публичных электронных торгах (аукционе) принимаются по 28.09.2023 г. до 17.00**
Контактные данные	**Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Стародорожский райагросервис» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:

• ЗДАНИЯ СКЛАДА с инв. № 645/С-9859 (составные части и принадлежности: навес, уборная) общей площадью 247,4 кв. м, адрес: Минская обл., г. Старые Дороги, ул. Кирова, 153/1.

• АДМИНИСТРАТИВНОГО ЗДАНИЯ с инв. № 645/С-9858 (составные части и принадлежности: пристройка, беседка, асфальтовая площадка, ограждение) общей площадью 85,1 кв. м, адрес: Минская обл., г. Старые Дороги, ул. Кирова, 153 (далее – Объекты).

Земельный участок частично (0,0009 га) расположен в охранной зоне электрических сетей напряжением до 1000 вольт.

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 625250100029000221 площадью 0,3924 га (право аренды по 03.10.2072), адрес земельного участка: Минская обл., г. Старые Дороги, ул. Кирова, 153.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 105 624,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **10 562,00** бел. руб.
Стоимость снижена на 10 %.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объектов производится в течение 30 (тридцати) календарных после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает продавцу затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 28.07.2023.

Аукцион состоится **27.09.2023** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.09.2023** до **16.00** в каб. 320 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11. Тел. для осмотра: (8029) 167 14 90, (801792) 38 5 76.

УНП 600026892

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

19 октября 2023 г. по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Смолевичи

Организатор аукциона: Смолевичский районный исполнительный комитет, 222201, г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь (га)	Целевое назначение	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)
1	Смолевичи, ул. А. Мицкевича, 5	624850100008000126	0,1403	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	21 000
2	г. Смолевичи, ул. Уютная, 7	624850100008000664	0,1500	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	31 000
3	г. Смолевичи, ул. Утулься (квартал 42, участок 22)	624850100008000820	0,1500	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	31 100

Аукцион состоится **19 октября 2023 г. в 15.00**
в Смолевичском районном исполнительном комитете по адресу: г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125, зал заседаний.
Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу:https://au.nca.by/, http://rlt.by/ru/, Смолевичского райисполкома: **isp@smolevichi.gov.by,** на сайте Минского областного исполнительного комитета.

УНП 600014139

КОММУНАЛЬНОЕ УНИТАРНОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

СООБЩАЕТ О ВНЕСЕНИИ СЛЕДУЮЩИХ ИЗМЕНЕНИЙ в извещение о проведении 22.09.2023 года аукциона № 5-АЧ по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества, находящегося в частной собственности:
предмет аукциона № 1 исключается из текста публикации в связи с отказом арендодателя от проведения аукциона.

Телефон для справок +375 (17) 360 42 22. Адрес в сети Интернет: www.mgcn.by.

УНП 190398583

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Вилейский райагросервис»

Лот	Наименование	Земельный участок и местонахождение лота	Начальная цена с учетом НДС 20%, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Кап. строение с инв. № 631/С-67692 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – здание мобильное, 33,2 кв. м, составные части и принадлежности: А1/к-здание мобильное, а-навес)	Кадастровый номер 621350100007002500, площадью 0,0229 га, назначение – для строительства и обслуживания здания мобильного. Право аренды. Ограничения (обременения) прав на зем. участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 Вольт, площадь 0,0001 га. Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, 103А	801 624,00	80 162,40	40 081,20
	Кап. строение с инв. № 631/С-67691 (назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – СКЛАД ЖКУ, 737 кв. м, составные части и принадлежности: А1/кп-технологическое здание, А-СКЛАД ЖКУ)	Кадастровый номер 621350100007002501, площадью 0,1282 га, назначение – для строительства и обслуживания склада ЖКУ. Право аренды. Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, 109А			
	Кап. строение с инв. № 631/С-67689 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад удобрений 1 химия, 1989,8 кв. м, составные части и принадлежности: А1/к-склад удобрений 1 химия, а-навес)	Кадастровый номер 621350100007002498, площадью 0,3076 га, назначение – для строительства и обслуживания склада удобрений 1 химия. Право аренды. Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, 109			
	Кап. строение с инв. № 631/С-67695 (назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – СКЛАД ФОСМУКИ С ПРИЕМНЫМ УСТРОЙСТВОМ И КОМПРЕССОРНОЙ, 162 кв. м, составные части и принадлежности: 1/кп-Компрессорная, 1А1/к-приемное устройство, а1-Навес, а2-Навес, А-СКЛАД ФОСМУКИ С ПРИЕМНЫМ УСТРОЙСТВОМ И КОМПРЕССОРНОЙ)	Кадастровый номер 621350100007002503, площадью 0,2309 га, назначение – для строительства и обслуживания склада фосмуки с приемным устройством и компрессорной по ул. Шубина в г. Вилейке. Право аренды. Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, 109Б			
	Кап. строение с инв. № 631/С-67694 (назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – СКЛАД ФОСМУКИ 1 ХИМИЯ, 0 кв. м, составные части и принадлежности: А-СКЛАД ФОСМУКИ 1 ХИМИЯ)	Кадастровый номер 621350100007002502, площадью 0,0316 га, назначение – для строительства и обслуживания склада фосмуки 1 химия по ул. Шубина в г. Вилейка. Право аренды. Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, 109В			
	Кап. строение с инв. № 631/С-67693 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад удобрений 1 химия, 2083 кв. м, составные части и принадлежности: А1/к-склад удобрений 1 химия, Б1/к-пристройка)	Кадастровый номер 621350100007002499, площадью 0,3064 га, назначение – для строительства и обслуживания склада удобрений 1 химия. Право аренды. Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, 107			
	АВТОВЕСЫ 40 ТН, инв. № 1145;	Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, 103А			
	КОНВЕЙЕР КТ 18, инв. № 1484;	Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, 109			
	Ресивер, инв. № 6048-ОС; компрессор, инв. № 6049-ОС; шкафы электрощитовые, инв. № 6047-ОС, 5 шт.	Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, 109Б			

В отношении лота проводятся первые торги

Дата и время проведения торгов	**19 октября 2023 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)**
Срок приема заявлений и внесения суммы задатка	**с 10.00 18 сентября 2023 года до 16.00 17 октября 2023 года**
Ограничения (обременения)	Лот № 1 имеет обременение в виде заключенных договоров аренды. Вопросы по обременениям по тел. +375293489225

Условия для участия в торгах:
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ОАО «Вилейский райагросервис», проводимых 19.10.2023.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. По вопросу осмотра объектов обращаться по телефонам: **+375299999112, Чеслав.** Дополнительная информация по предмету торгов по тел. **+375293082762, Екатерина.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

Информация о продавце	**ОАО «Вилейский райагросервис» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375172552928 (222416, г. Вилейка, ул. 1 Мая 105, УНП 600010756)**
Организатор аукциона	**ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg**

З агеньчыкам

Пэндзаль, аловак і долата

Гэтыя прылады патрэбныя вясковаму настаўніку Сяргею ШАМІНСКАМУ, каб навучыць дзяцей бачыць святлацені і перспектывы іх жыцця

Прозвішча Шамінскі ў раскладзе Доўскай сярэдняй школы Рагачоўскага раёна стаіць насупраць чатырох прадметаў: сусветная мастацкая культура, чарчэнне, маляванне, тэхнічная праца. А яшчэ за настаўнікам — любімае школьнікамі аб'яднанне па інтарэсах «Юны мастак» і персанальныя заняткі з вучнем, які мае асаблівасці псіхафізічнага развіцця. Сем гадзін тэхнічнай працы ў базавай Серабранскай школе за некалькі кіламетраў ад Доўска — таксама яго абавязак.

Усё гэта шчасце на педагога звалілася не адразу — нагрузку ў гадзінах і прадметах дадавалі паступова. Такім чынам, за 33 гады работы ў адной установе адукацыі настаўнік Сяргей Шамінскі стаў не толькі майстрам на ўсе рукі, але сёння яшчэ і прэтэндуе ад Гомельшчыны на галоўную ўзнагароду педагогаў краіны ў конкурсе прафесійнага майстэрства «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь — 2023» у намінацыі «Музыка, выяўленчае мастацтва, мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура), працоўнае навучанне, фізічная культура і здароўе, дапрызыўная падрыхтоўка».

Пінгвіны і дэмбельскія альбомы

Доўск, дзе нарадзіўся і жыве педагог, сёння не вельмі вялікі населены пункт, хоць і носіць званне аграгарадка. Чарнобыль зрабіў сваю чорную справу — частка людзей з'ехала з гэтых мясцін на чысцейшыя тэрыторыі. Доўск знаходзіцца на скрыжаванні міжнародных аўтамагістраляў, і адсюль наўпрост зручна дабірацца да Гомеля, Мінска, Магілёва і Масквы. Ва ўжо далёкім 1983 годзе адсюль выпускнік мясцовай школы Сяргей Шамінскі, які не меў ніякай пачатковай мастацкай адукацыі, з'ехаў вучыцца ў Віцебск. У сына даяркі і будаўніка было вострае жаданне стаць мастаком. Сёння ён з пяшчотай успамінае, што матуля захавала ўсе яго дзіцячыя малюнкі з пінгвінамі, а тата, які працаваў прарабам, ведаў на памяць шмат вершаў, разбіраўся ў класічнай музыцы і вывучаў гісторыю. Кажа, усе таленты, якія не раскрыліся ў яго бацьках з-за складаных абставін пасляваеннага дзяцінства, рэалізоўваў ён.

— Мае бацькі жартавалі, што я нарадзіўся з алоўкам у руцэ. Да таго як паступіў на мастацка-графічны факультэт Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Кірава, у Доўску разам з настаўніцай гісторыі мы стварылі музей баявой і гістарычнай славы нашага населенага пункта. Яшчэ тады навучыўся рабіць стэнды, распісваць сцены, ствараць макеты. У інстытуце пачынаў з падрыхтоўчых курсаў. Засваенне на іх акадэмічнага малюнка дапамагло мне паступіць у ВНУ.

Студэнтаў дзённых факультэтаў тады, у сярэдзіне 1980-х, сталі забіраць у армію. Шамінскі ўвільваць не стаў. Сёння ўспамінае службу ў Маскоўскай ваеннай акрузе, у войсках ППА як добрую школу жыцця. Ну і дэмбельскія альбомы, вядома, рабіў. Іх яму сябры замаўлялі.

— Афармляў альбомы для ўсіх таварышаў па службе: з пацешнымі малюнкамі, фатаграфіямі, абгорнутыя ў сукно з салдацкага шыняля. Сабе вось толькі не паспеў зрабіць. Усё, што нагадвае пра армію, сістэматызаваў у каталог ужо праз дзясятак гадоў. Там армейскія замалёўкі, лісты бацькоў і свае. Пасля арміі вярнуўся ў інстытут і зноў паглыбіўся ў студэнцкае жыццё.

За сям'ёй як за сцяной

Прызнаецца, калі паступаў і вучыўся — не думаў, што стане вясковым настаўнікам. Галоўным было атрымаць мастацкую адукацыю. Аднак, калі дыплом быў на руках, вярнуўся ў родны Рагачоўскі раён.

Не быў я тады ўпэўнены, што застануся ў школе надоўга. Аднак мяне так зацягнула, што нікуды я ні з Доўска, ні са сваёй школы не збіраюся з'язджаць. Як навагодняя ёлка цацкамі, абрастаеш рознымі прыхільнасцямі і абавязкамі перад людзьмі. Гэта тыя ніткі, якія немагчыма абарваць. Тым больш тут з часам сям'я ўтварылася. Цяпер мая жонка працуе ўрачом-лабарантам у Доўскай бальніцы. У нас дзве дачкі. Святлана ўжо скончыла ўніверсітэт у Мінску і працуе камп'ютарным дызайнерам. Лізавета вучыцца ў 10 класе. Жонка — мой натхняльнік, шмат разоў мяне выратоўвала, у тым ліку ў прамым сэнсе — у ковідныя часіны. Гэта мая апора, і я вельмі ёй удзячны за ўсё. Цяпер, калі я цалкам паглыблены ў падрыхтоўку да конкурсу, на Таццяне вялікая частка побытавых клопатаў.

Школьная эквілібрыстыка

Сяргей увесь час жартуе з сябе. Зрэшты, гумар — гэта яго фірмовы стыль і на ўроках. Яшчэ адзін плюсік, за што яго любяць вучні. Хоць, прызнаецца, момантаў расчаравання ён не пазбег.

— І ўсё ж неяк утрымаўся ў школе. Паступова прыходзіў прафесіяналізм, а вось стаўленне да вучняў, да працы засталося тое ж, што і 33 гады назад. Я не страціў цікавасці да таго, чым столькі гадоў займаюся. Прадметы, якія вяду, не з'яўляюцца асноўнымі. Іх лёгка можна «пасунуць». Хоць, калі дзесьці школу трэба пазіцыянаваць, то менавіта гэтыя прадметы дапамагаюць прадставіць установу максімальна ярка — на конкурсах, фестывалях ці алімпіядах.

Сельскі настаўнік — гэта эквілібрыст і жанглёр адначасова. Трэба ўмець захоўваць раўнавагу і маніпуляваць у вызначаным рытме, калі ў цябе чатыры розныя прадметы ў раскладзе і ўсе паралелі адначасова — ад першага да 10 класаў. А яшчэ «любімая» ўсімі педагогамі дакументацыя.

— Я толькі ў адзінаццатым класе не працую. Даводзіцца хутка пераключацца. Першы ўрок — маляванне ў другім класе, другі — чарчэнне ў дзясятым. Трэці — сусветная мастацкая культура ў сёмым класе, чацвёрты — тэхнічная праца ў пятым... Розныя не толькі прадметы, але і ўзрост дзяцей. Розныя асаблівасці псіхафізіялагічнага развіцця вучняў, розная інфармацыя, методыка, тэрміналогія, даты, лічбы... Пры тым, што вучэбная нагрузка, мабыць, традыцыйная для педагога — 30 гадзін у тыдзень.

Але, прызнаецца, ёсць і кампенсацыя за напружанне: дзеці ставяцца з любоўю і павагай. Напрыклад, калі ідзе па калідоры ў працоўным халаце трудавіка, за крысо чапляюцца хлапчукі і дзяўчынкі з малодшых класаў, у якіх ён вядзе маляванне.

— Гэта міла і смешна адначасова, — згадвае Сяргей Міхайлавіч. — Такая непасрэдная праява дзіцячых пачуццяў акрыляе. Малыя з пачатковых класаў да мяне на пераменах прыбягаюць у майстэрню, разглядаюць вырабы, зробленыя рукамі старэйшых вучняў. Адзін хлопчык доўга хадзіў як зачараваны, а потым кажа: «Я тут жыў бы».

Разважай як мастак

Са сваіх вучняў Шамінскі вырасціў паслядоўнікаў. Але, кажа, іх не так многа, паколькі прафарыентацыяй разам з настаўнікамі займаюцца бацькі. Іх прыярытэты, зразумела, моцна ўплываюць на выбар падлеткаў.

— Не сакрэт, што бацькі думаюць пра тое, колькі іх нашчадак будзе зарабляць. І ўсё ж ёсць тыя, хто звязваюць жыццё з тымі кірункамі, якія атрымалі на маіх уроках. Хтосьці паступіў на архітэктуру, хтосьці — у тэхнічныя ВНУ, дзе вельмі запатрабавана чарчэнне. Праз 10 гадоў сустракаю аднаго з вучняў, ён прызнаецца: «Сяргей Міхайлавіч, дзякуючы вам я ў інстытуце яшчэ і падзарабляў — чарцяжы рабіў аднакурснікам». Адна мая вучаніца стала стылістам прычосак. Прыходзіла да мяне на кансультацыі, калі выконвала мастацкія заданні. Чарчэнне ў школе вывучаюць толькі адзін год — у дзясятым класе. А аб'ём праграмы прыкладна той жа, які і быў, калі прадмет вывучалі два гады. Сёння ў Беларусі ствараецца новы падручнік па чарчэнні, і мяне запрасілі стаць адным з яго рэцэнзентаў. Гэта вельмі працаёмкая, але важная работа, бо прадмет спрыяе развіццю прасторавага і вобразнага мыслення ў дзяцей.

У аб'яднанні па інтарэсах «Юны мастак» ідзе не толькі класічная акадэмічная работа з пастаноўкай рукі, уменнем бачыць святлацені і адлюстроўваць перспектыву. Шамінскі займаецца з вучнямі тым, што яму самому цікава на гэтым адрэзку жыцця. Напрыклад, гэта можа быць размалёўка камянёў, яйкаў — драўляных і курыных, птушыных пёраў ці лямпачак.

— З лямпачак ствараем арт-аб'екты. Мы не паўтараем нечыя работы з інтэрнэту. Задача — стварыць нешта новае. У нас прадстаўлены розныя віды мастацтва. За некалькі дзён да занятку ў аб'яднанні па інтарэсах я ноччу на кухні прыдумваю заданне, цікавае для вучняў. Выконваю сам узор, затым для кожнага дзіцяці рыхтую матэрыялы, інструменты. А яшчэ распрацоўваю паслядоўнасць выканання задання.

Вынікам становяцца выставы ў калідоры школы. Для педагога важна не проста прыляпіць малюнкі на сцяну. Кожную работу ён афармляе ў пашпарт, прыдумвае назву. Атрымліваецца цэласная прадуманая кампазіцыя. Прыгожая афіша да яе — абавязковая ўмова.

Тэмперамент вавёркі

Калі гутарка заходзіць пра ўласную творчасць, Сяргей Шамінскі ўспамінае пра сваю дзіцячую любоў. Кажа, у трэцім класе заразіўся індзейскай тэматыкай — дзякуючы папулярнай у 70—80-я гады мінулага стагоддзя серыі фільмаў з Гойка Міцічам у галоўнай ролі. Сербскі акцёр стаў знакаміты, выконваючы ролі індзейцаў у нямецкіх фільмах. У познім Савецкім Саюзе амаль усе хлопчыкі атаясамлівалі сябе з Чынгачгукам — Вялікім Змеем, але Сяргей Шамінскі захаваў адданасць да гэтага часу:

— Больш чым 50 гадоў я гэтай тэматыкай займаюся. У Харватыі, на месцах здымак фільмаў, прысвечаных індзейскай тэматыцы, праходзяць тэматычныя кінафестывалі. Некалькі гадоў я рабіў для іх афішы, якія з'яўляліся візітнай карткай фестывалю. У мяне не было магчымасці самому пабываць там, а вось мае знаёмыя сустрэліся з Гойка Міцічам, распавялі яму пра мяне, і ён даў асабістыя аўтографы: «Сяргею — усяго добрага. Міціч Гойка». Калі казаць пра маю творчасць, то цяпер я асвойваю скульптуру з дрэва, афармляю паштоўкі, вокладкі пласцінак і кніг. Усім гэтым займаюся па начах, паколькі ў маім вясковым жыцці важнымі застаюцца агарод і дом. Калі зняць на відэа вавёрку ў коле, што круціцца, яе не будзе бачна з-за хуткасці. Гэта пра мяне.

Паміж агародам, школай, удзелам у выстаўках малюнкаў, міжшкольных спартыўных, музычных і тэатральных спаборніцтвах, а таксама рыхтуючыся да фіналу ў конкурсе прафесійнага майстэрства педагагічных работнікаў «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь — 2023», Сяргей Міхайлавіч нагадвае: нам важна ўмець шанаваць простыя рэчы:

— У чалавека павінны быць уяўленні пра прыгажосць у гэтым свеце, у паўсядзённым жыцці, якія важна перадаваць сваім дзецям. Гэта тое, чаго не заменіш ніякай тэхнікай і развіццём сучасных тэхналогій. Самае галоўнае — заставацца шчырым. Настаўнік — вельмі высокае званне, і яно абавязвае нас да таго, каб у любой жыццёвай сітуацыі заставацца чалавекам.

Вольга АЎРАМЕНКА.

Супрацоўніцтва

МЕМАРАНДУМ УМАЦОЎВАЕ СЯБРОЎСТВА

У Пасольстве Федэратыўнай Рэспублікі Бразілія ў Мінску адбылася прэс-канферэнцыя, прысвечаная знакавай падзеі ў беларуска-бразільскім адукацыйным супрацоўніцтве. Удзел у ёй прыняў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Бразіліі ў Беларусі Бернард Жорг Леапольд дэ Гарсія Клінгл.

Падпісаныя гэтымі днямі мемарандумы пра ўзаемаразуменне паміж Федэральным універсітэтам Мінас Жэрайс, БДУ, БДЭУ і БДУІРам былі распрацаваны з улікам асаблівасцяў і зацікаўленасці кожнай ВНУ. Ва ўлік бралася і тое, наколькі супадала ў кожнага ўніверсітэта запатрабаванасць у такім супрацоўніцтве.

Было адзначана, што ў гэтай справе абодва бакі аб'ядноўвае гатоўнасць універсітэтаў праводзіць акадэмічны абмен сярод выкладчыкаў і студэнтаў. Першы крок у гэтым прадугледжвае вывучэнне партугальскай мовы беларускімі студэнтамі і беларускай мовы — партугальскімі. Супрацоўніцтва будзе паглыблена ў розных кірунках: бразільскі бок цікавіць прыкладная медыцына, інфармацыйныя тэхналогіі, права, эканоміка.

Бразільскі ўніверсітэт з'яўляецца не толькі адукацыйнай, але і даследчай установай, вынікі працы яго даследчыкаў прыносяць значную карысць грамадству. Напрыклад, сёння ва ўніверсітэце ствараюць першую бразільскую вакцыну супраць ковіду. Распрацоўкамі ў галіне штучнага інтэлекту карыстаюцца бразільскія медыцынскія ўстановы.

Бразільскі бок выказаў намер у далейшым пашырыць кола супрацоўніцтва і наладзіць такія ж адносіны паміж Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам, Мінскім лінгвістычным універсітэтам. У перспектыве пажадана праводзіць сумесныя даследаванні, выдаваць сумесныя навуковыя працы, выкарыстоўваць рэсурсы аддаленага навучання. Спрыяць гэтаму будзе і тое, што для наведвання Бразіліі беларусам не патрабуецца турыстычная віза, а федэральны ўніверсітэт з'яўляецца дзяржаўнай установай і адукацыя ў ім бясплатная.

Яўген ПЯСЕЦКІ, фота аўтара.

КАРАНІ і КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя

№ 2 (74)

ЭКАНОМІКА ЗАМКНЁНАГА ЦЫКЛА І 2 °С ГЛАБАЛЬНАЙ ТЭМПЕРАТУРЫ

Экалагічныя праблемы эксперты абмеркавалі на выставе «ECOLOGY EXPO»

Выкарыстанне другасных матэрыяльных рэсурсаў для вырабу новай прадукцыі ў межах эканомікі замкнёнага цыкла. Скарачэнне выкідаў парніковых газаў да 2030 года на 35 % ад узроўню 1990-га дзеля запавольвання змен клімату. З'яўленне новых тэхналогій і прадпрыемстваў, якія прадухіляюць утварэнне адходаў. Гэтыя і іншыя экалагічныя пытанні абмяркоўваліся падчас II Міжнароднай спецыялізаванай выставы «ECOLOGY EXPO-2023» у Мінску. Госці з больш як 14 краін прадставілі свае дасягненні і бізнес-практыкі, якія дазваляюць эфектыўна выкарыстоўваць адходы, беражліва карыстацца прыроднымі рэсурсамі, абыходзіцца з небяспечнымі адходамі, ukараняць «зялёныя» тэхналогіі ў энергетыку, стварацьбіяўпакоўку.

МІНІМАЛЬНАЕ ЎТВАРЭННЕ, МАКСІМАЛЬНАЯ ПЕРАПРАЦОЎКА І АБЯСШКОДЖВАННЕ

Ахоўваючы прыроду, мы ствараем перадумовы для развіцця сённяшняга і будучага пакаленняў. Ахоўваючы прыроду, ахоўваем нашу краіну. Сёння экалагічныя праблемы паставілі экатэму на ўзровень з надзённымі эканамічнымі пытаннямі, таму так важна ўдзяляць пільную ўвагу вырашэнню і маніторынгу экапраблем, упэўнены **Андрэй ХУДЫК, міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя**:

— Немагчыма сёння развіваць эканоміку ніводнай краіны, не развіваючы экалагічную тэму. У нас з гэтым пытаннем усё ў парадку, а пытанні экапавесткі — на самым высокім узроўні — на кантролі ў Прэзідэнта і ўрада. Як сказаў Прэзідэнт, «для мяне прырода — прыярытэт прыярытэтаў, ёсць прырода — ёсць жыццё, няма прыроды — няма жыцця». Сапраўды, у галіне экалогіі наша краіна — прыклад для ўсёй постсавецкай прасторы.

У рамках выставы эксперты правялі шэраг тэматычных пляцовак, дзе абмеркавалі экалагічныя праблемы і шляхі іх вырашэння. Прафесіяналы галіны заўважылі, што яшчэ ў часы кіравання Пятра І яго ўказ «абавязваў збіраць усялякія палотны і абрэзкі і наземным і водным шляхам дастаўляць у Санкт-Пецярбург для перапрацоўкі, а таксама аплачваць здадзеныя адходы». У Савецкім Саюзе таксама існавала планавая эканоміка па ўключэнні адходаў у стварэнне новай прадукцыі.

У сучаснай Беларусі існуе комплексная сістэма па рэгуляванні абыходжання з адходамі. Адна з найгалоўнейшых задач эканомікі замкнёнага цыкла — мінімізацыя стварэння адходаў і максімальнае іх выкарыстанне. Многія прынцыпы і падыходы такой эканомікі замацаваны заканадаўча, найперш Нацыянальнай стратэгіяй устойлівага развіцця да 2035 года.

— Яшчэ ў 2012-м Беларусь замацавала прынцыпы пашыранай адказнасці вытворцаў, пастаўшчыкоў тавараў і ўпакоўкі, скіраваныя на павышэнне ўзроўню збору, выкарыстання і перапрацоўкі адходаў і тавараў, а таксама зніжэнне затрат на абыходжанне з імі, — нагадаў **Аляксандр КОРБУТ, першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя**. — Пры гэтым адказнасць за зніжэнне затрат на абыходжанне з адходамі ляжыць непасрэдна на вытворцах. Цягам усяго жыцця вытворцы тавараў і ўпакоўкі адказныя за лёс як тавару, так і адходаў. Першасныя задачы ў галіне кіравання адходамі — прадухіленне іх утварэння. Для гэтага неабходна забяспечыць павышэнне рэсурсаэфектыўнасці вытворчасці, палепшыць экалагічны дызайн прадукцыі і сфарміраваць культуру адказнасці спажывання тавараў.

На прадпрыемствах Беларусі праводзяцца меры па ўкараненні энергаэфектыўных тэхналогій і абсталявання: зніжаюцца аб'ёмы ўтварэння адходаў, уцягваюцца ў паліўны баланс аднаўляльныя крыніцы энергіі, ствараюцца новыя магчымасці для дадатковай занятасці людзей. За апошнія дзесяцігоддзі ў краіне запушчана вытворчасць офіснай паперы з другасных матэрыяльных рэсурсаў на Папяровай фабрыцы Дзяржзнака ў Барысаве. Створана вытворчасць па перапрацоўцы адпрацаваных элементаў сілкавання на базе рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства вылічальнай тэхнікі і інфарматыкі «БелВТІ». Наладжана вытворчасць шкляной

тары з выкарыстаннем інавацыйных энергаэфектыўных, ресурсазберагальных тэхналогій на Гродзенскім шклозаводзе.

На некаторых сельгаспрадпрыемствах збудаваны біягазавыя і энергетычныя комплексы па перапрацоўцы адходаў сельскагаспадарчай вытворчасці. Рэалізуюцца дэманстрацыйныя праграмы па рэсурсаэфектыўнай вытворчасці на прадпрыемствах па перапрацоўцы сельгасгаліны, а таксама ў галіне вырабу будаўнічых матэрыялаў і вырабаў. Ажыццяўляюцца інавацыйныя праекты па ўкараненні малаадходных тэхналогій на прадпрыемствах прамысловасці, металургіі, распавёў Аляксандр Корбут:

— Дзякуючы праекту міжнароднай дапамогі, які рэалізуецца Мінпрыроды сумесна з праграмай развіцця ААН у Беларусі, з нашай краіны вывозяцца і абясшкоджваюцца небяспечныя адходы. Гэтая работа скіравана на ахову здароўя насельніцтва і навакольля, а таксама выкананне абавязкаў Беларусі, прадугледжаных Стакгольмскай канвенцыяй. Падтрымку ў гэтым аказваюць замежныя партнёры — польская кампанія «Геакома», якая ўжо ачысціла 21 склад сельгаспрадпрыемстваў у Гродзенскай і Віцебскай абласцях, у выніку чаго за мяжу вывезена на абясшкоджванне 920 тон непрыдатных пестыцыдаў. Цяпер кампанія займаецца пераўпакоўкай непрыдатных пестыцыдаў у Мінскай вобласці, і, як чакаецца, яшчэ 500 тон будуць вывезены на абясшкоджванне.

Славацкая кампанія «Равані» вывезла больш за 350 тон адходаў, якія ўтрымліваюць ПХБ, а французская кампанія «Трыдзі» — 500 тон такіх адходаў ад васьмі буйных прадпрыемстваў — уласнікаў небяспечных адходаў. Мінпрыроды разлічвае, што супрацоўніцтва ў гэтым кірунку працягнецца.

АДХОДЫ АДНЫХ — СЫРАВІНА ДЛЯ ІНШЫХ

Для рашэння новых задач неабходна сфарміраваць шматузроўневую сістэму абнаўлення развіцця эканомікі замкнёнага цыкла, павысіць рацыянальнае выкарыстанне ўсіх відаў сыравінных і паліўна-энергетычных рэсурсаў. Важна таксама развіваць партнёрства для замыкання вытворчых ланцужкоў, скіраваных на змяншэнне ўтварэння адходаў і максімальнае іх выкарыстанне, ствараць безадходныя і малаадходныя вытворчасці замкнёнага цыкла па прынцыпе «нуль адходаў». Немалаважна і ўкараненне экалагічнага дызайну прадукцыі, а таксама павелічэнне выробу і ўжывання экалагічна бяспечнай упакоўкі. Для развіцця эканомікі замкнёнага цыкла павінны быць створаны ўмовы для развіцця бізнесу, забяспечаны попыт на другасную сыравіну, існаваць шэраг іншых эканамічных стымулаў, перакананы эксперты.

— Пытанні экалогіі ў частцы вытворчасці замкнёнага цыкла — магчымасці для развіцця бізнесу, — упэўнена **Таццяна БРАНЦЭВІЧ, намеснік міністра эканомікі**. — Калісьці была праблема, куды падзець малочную сыроватку, адходы якой проста выліваліся. Каб вырашыць пытанне, стварылі вытворчасць па вырабе сухой малочнай сыроваткі з гэтых адходаў. А цяпер гэты тавар, які экспартуецца, і сёння шмат прадпрыемстваў, якія выкарыстоўваюць адходы як сыравіну.

БМЗ практычна на 100 % выкарыстоўвае металалом. Папяровыя фабрыкі і шкляныя прадпрыемствы на 50 % працуюць на другаснай сыравіне. Пытанне ў эканамічным складніку. Раней было вельмі зручна купіць на замежных рынках сыравіну, той жа кварцавы пясок (сыравінныя рэсурсы ў нашай краіне абмежаваныя), і працаваць. Цяпер Беларусь пастаўлена ў пэўныя ўмовы выжывання, і тэхналагічны прагрэс дазволіў нам ствараць прадукцыю з другаснай сыравіны. Такім чынам адразу вырашаюцца два пытанні: экалагічнасці і развіцця бізнесу, падкрэсліла спецыяліст:

— Вялікую ролю ў гэтым іграе навука, якая дазваляе нам ствараць новыя прадукты. Адзін з прыкладаў пастяховай работы — кампанія, якая стварае модульныя смеццеперапрацоўчыя прадпрыемствы. Пры гэтым заказчык можа выбраць ступень глыбіні перапрацоўкі: ад 25 % да 90 %. Акрамя таго, кампанія-вытворца прапануе яшчэ каля 40 модуляў, з дапамогай якіх з другаснай сыравіны можна выпрабляць розную прадукцыю: ёлачны «дожджык», шчоткі для ЖКГ, плітні для пакрыцця тэрыторыі і іншае.

Павысіць эфектыўнасць збору другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР) і спрасціць іх наступны продаж ці адчужэнне, каб ведаць, хто і якія адходы можа прапанаваць, можна ў тым ліку і з дапамогай электроннай гандлёвай пляцоўкі — Беларускай універсальнай гандлёвай біржы. Месяц таму тут быў запушчаны пробны модуль, з дапамогай якога, зыходзячы з патрэб прадпрыемстваў, на электронных таргах у адкрытым доступе ўжо з'явілася каля 200 лотаў з неліквіднай прадукцыяй.

— Зразумела, што не ўсе адходы падыдуць для рэалізацыі на гэтай пляцоўцы, аднак найперш мы арыентуемся на класічныя ДМР (макулатура, шклотара, пластык), — заўважыў **Дзмітрый ПРАКАПЧУК, начальнік упраўлення таргоў прамысловымі спажывецкімі таварамі «Беларускай універсальнай таварнай біржы»**. — Мяркую, што электронны гандаль стане адным з прыярытэтных кірункаў далейшага развіцця абароту другаснай сыравіны.

СУПРАЦЬ ПАРНІКОВЫХ ГАЗАЎ І ЭКСТРЭМАЛЬНЫХ ТЭМПЕРАТУР

Хоць эканамічная дзейнасць нясе прыбытак чалавецтву, ды і ўплывае на змену клімату, найперш праз выкіды парніковых газаў, на скарачэнне якіх скіравана палітыка многіх дзяржаў свету ў межах Парыжскага пагаднення. Галоўная мэта дакумента — абмежаваць павышэнне глабальнай тэмпературы ў гэтым стагоддзі да двух градусаў.

— Згодна са штогадовым дакладам Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі (СМА), летась засухі, паводкі і цеплавыя хвалі закранулі насельніцтва ўсіх кантынентаў і прывялі да шматмільярдных страт. Выкіды парніковых газаў працягваюць расці, клімат мяняецца, а насельніцтва планеты падвяргаецца ўздзеянню экстрэмальных умоў надвор'я, — адзначыў **Іван ПРЫХОДЗЬКА, намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя**. — СМА прагназуе, што ў найбліжэйшыя пяць гадоў рост глабальных тэмператур дасягне рэкордных узроўняў. Для Беларусі рост сярэднегадавой тэмпературы паветра (з 1976 года) склаў 0,6 градуса ў дзесяць гадоў, і такі тэмп удвая перавышае хуткасць росту тэмпературы паветра на сушы ў паўночным паўшар'і. Хвалі цяпла ў краіне сталі штогадовай з'явай і цягнуцца 5—10 дзён, павялічваюцца небяспечныя з'явы, звязаныя з моцнымі дажджамі і ліўнямі. Мяняюцца агракліматычныя вобласці, а на поўдні Беларусі стварылася новая, больш цёплая, плошча якой працягвае павялічвацца.

Згодна з абавязацельствам, якое ўрад Беларусі зацвердзіў у верасні 2021-га, да 2030 года выкіды парніковых газаў плануецца скараціць на 35 % ад узроўню 1990-га. Дасягнуць гэтага мяркуюць у рамках дзяржаўных і галіновых праграм на 2021—2025 гады, сярод якіх павышэнне энергаэфектыўнасці ў сектары прамысловасці, будаўніцтва і ЖКГ, развіццё электратранспарту. Прымяняюцца новыя метады і ўдасканальваюцца тэхналогіі ў сельскай гаспадарцы, выкарыстоўваюцца аднаўляльныя крыніцы энергіі, аднаўляюцца тарфянікі, павялічваюцца плошчы лясоў.

Намеснік міністра заўважыў, што Беларусі, як і ўсім краінам Еўрапейскага саюза, прыйдзецца працаваць ва ўмовах зніжэння вугляродаёмістасці эканомікі. Так, распрацоўваецца канцэпцыя Экалагічнага кодэкса з наступным яго прыняццем, выпрацоўваецца стратэгія доўгатэрміновага развіцця з нізкім узроўнем выкідаў парніковых газаў да 2050 года, а таксама нацыянальны план дзеянняў у галіне адаптацыі да змен клімату. У Нацыянальную сістэму маніторынгу ўкараняецца справаздачнасць і верыфікацыя выкідаў парніковых газаў. Усё гэта будзе садзейнічаць далейшаму развіццю нізкавугляроднай эканомікі і паляпшэнню якасці жыцця людзей.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара і Андрэя КАРАБЕЛЬНІКАВА.

РАЗАМ ЗА ЗЯЛЁНУЮ БЕЛАРУСЬ

Цікавосткі экалагічнага форуму ў Століне

Напрыканцы Экалагічнага тыдня ў Беларусі адбыўся XVII Рэспубліканскі экалагічны форум, прымеркаваны да Года міру і стваральнай працы. Больш за 400 прадстаўнікоў грамадства сабраліся ў Століне для абмеркавання пытанняў аховы навакольнага асяроддзя, рацыянальнага карыстання прыроднымі рэсурсамі, павышэння экалагічнай культуры і папулярызацыі экалагічнага руху сярод насельніцтва краіны.

У якасці культурна-забаўляльнай праграмы для ўдзельнікаў і гасцей форуму былі арганізаваны канцэрт-прывітанне «Мы за зялёны свет і стваральную працу», розныя атракцыёны і інтэрактыўныя пляцоўкі. Можна было наведацца ў Музей драўляных скульптур, Музей-сядзібу ганчара, трапіць на экскурсію на экасцежку «Альманскія балоты».

Вялікі наплыў людзей выклікалі традыцыйныя і экалагічныя вырабы мясцовых рамеснікаў. Наогул нельга не адзначыць кранальнае імкненне палешукоў — ад дарослых да дзетак — зрабіць свой унёсак у экасвята рэгіёна. Па меркаванні **Валерыя БЕЛЬСКАГА, намесніка Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу**, такія адносіны да экалогіі, уздым экаруху ў беларускім грамадстве ў цэлым — сведчанне вялікай «экаасветніцкай работы з насельніцтвам, значнай часткай якой з'яўляецца і XVII Рэспубліканскі экалагічны форум».

Для сувязі пакаленняў і здаровага асяроддзя

Стартаваў форум з урачыстага парада дэлегатаў. Па цэнтральнай вуліцы горада да плошчы, дзе размясцілася галоўная пляцоўка мерапрыемства, прайшлі прадстаўнікі Мінпрыроды і падпарадкаваных ёй арганізацый, мясцовых тэрытарыяльных органаў улады, установ адукацыі, навукі і культуры, грамадскіх і экалагічных аб'яднанняў і іншыя. Дарослых і маленькіх удзельнікаў чакаў невялікі, але надта сімвалічны перформанс ад арганізатараў, пасля якога адбылося афіцыйнае адкрыццё форуму.

Міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК ва ўступным слове падкрэсліў, што асновай для рэалізацыі ўстойлівага развіцця нашай краіны з'яўляецца забеспячэнне здаровага навакольнага асяроддзя, спрыяльных умоў жыцця сучаснага і наступных пакаленняў:

— Галоўныя падзеі Экалагічнага тыдня накіраваны не толькі на прэзентацыю вынікаў, дасягнутых у прыродаахоўнай галіне, але на выяўленне новых перспектыў яе далейшага развіцця.

Пасля ўрачыстых прамоў стартавала цырымонія ўзнагароджання пераможцаў Рэспубліканскага аглядуконкурсу на найлепшае добраўпарадкаванне паверхневага воднага аб'екта, а таксама супрацоўнікаў прыродаахоўных ведамстваў, грамадскіх экаактывістаў, чыноўнікаў — за дасягненні на ніве аховы навакольнага асяроддзя. Атрымалі знакі падзякі за ўсебаковае бесперапыннае асвятленне экападзей, папулярызацыю экаруху сярод насельніцтва і СМІ. Так, падзяку міністра атрымала карэспандэнт газеты «Гомельская праўда», граматамі Мінпрыроды ўзнагароджаны Міждзяржаўная тэлерадыёкампанія «Мір» і прадстаўніца радыёцэнтра тэлерадыёкампаніі «Магілёў», а ганаровую грамату ўручылі агенцтву «БелТА».

Наступным пунктам дзелавой праграмы быў мітынг-рэквіем памяці ахвяр фашызму ва ўрочышчы Стасіна. Удзельнікі форуму прайшлі «Дарогай памяці і смутку», па якой у 1942—1944 гадах пад дулам аўтамата нацысты і паліцаі правялі на расстрэл 5332 мужчыны, 3620 жанчын і 3548 дзяцей. Члены дэлегацыі ўшанавалі памяць загінулых. Кіраўнік Мінпрыроды заклікаў прысутных ніколі не забываць «жорсткасць, бесчалавечнасць і бясчынствы ворага на нашай зямлі», а таксама не сыходзіць «з выбранага шляху міру і стваральнай працы».

Закладка алеі ў гарадскім парку «Манькавічы» (помнік прыроды рэспубліканскага значэння, на тэрыторыі якога растуць 35 відаў дрэў і кустоў, у тым ліку дуб паўночны, лістоўніца еўрапейская і іншыя) стала своеасаблівым водгукам на прамову міністра ў Стасіне:

— Дрэвы — сімвал вечнага жыцця, дабра, сувязі пакаленняў. Таму алея, закладзеная ў Год міру і стваральнай працы, стане ўвасабленнем адзінства беларускага народа, беражлівага стаўлення да прыроды, пераемнасці пакаленняў, міру і згоды. Захаванне і прымнажэнне прыгажосці роднай зямлі — праява любові да Радзімы і жадання зрабіць яе лепшай, больш утульнай і прыгожай.

Для рэалізацыі МУР і экатурызму

Пасля закладкі алеі распачалася работа на дыскусійных пляцоўках. На канферэнцыі «Міжсектаральнае супрацоўніцтва ў кантэксце дасягнення МУР», што сабрала за адным сталом нацыянальнага каардынатара МУР і прадстаўнікоў Мінпрыроды, Міністэрства эканомікі, Міністэрства лясной гаспадаркі, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, ПРААН, маладзёжных паслоў МУР, абмяркоўваліся меры, якія прымаюцца ў нашай краіне (на нацыянальным і рэгіянальным узроўнях), для рэалізацыі экалагічных Мэт устойлівага развіцця.

У цэнтры ўвагі трох сесій — сучасны стан і сістэмныя кліматычныя рашэнні ў кантэксце МУР, пытанні фінансавання дадзенай дзейнасці. У прыватнасці, былі агучаны меры, якія прымаюцца для забеспячэння ўсеагульнага доступу да недарагіх, надзейных і сучасных крыніц энергіі, стварэння спрыяльных умоў для жыцця грамадзян і аховы навакольнага асяроддзя, змякчэння наступстваў змены клімату і іншыя.

Стан і перспектывы развіцця маніторынгу атмасфернага паветра, фарміраванне сістэмы айчыннага радыяцыйнага маніторынгу, інфармацыйныя рэсурсы Галоўнага інфармацыйна-аналітычнага цэнтра «Белгідрамета» — гэтым і іншым пытанням была прысвечана навукова-практычная канферэнцыя, прымеркаваная да юбілею Нацыянальнай сістэмы маніторынгу навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь.

Блакітныя чыстыя рэкі і азёры, густыя велічныя лясы, унікальныя балотныя масівы — шматгранная прырода нашай краіны вельмі пасуе для папулярызацыі экатурызму. Найбольшую прывабнасць пры гэтым маюць асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі (ААПТ), таму цэнтральнай тэмай на круглым стале «Развіццё экалагічнага турызму ў Рэспубліцы Беларусь» было пытанне захавання экасістэм і біяразнастайнасці ва ўмовах развіцця экатурызму. Шмат увагі таксама аддавалася стварэнню ўмоў і вызначэнню патрабаванняў экасертыфікацыі экатурыстычных прадуктаў, практыцы валанцёрства, арганізацыі экатурыстычных маршрутаў і іншых паслуг у розных заказніках, запаведніках і на ААПТ — не толькі ў нашай краіне, але і ў Расійскай Федэрацыі.

Аб перспектывах развіцця мінеральна-сыравіннай базы Брэсцкага Палесся пагаварылі на аднайменным круглым стале. Былі прадстаўлены вынікі праведзеных геолагаразведачных работ, дзякуючы якім знойдзены ўнікальныя радовішчы базальтаў і туфаў — Навадворскае (Пінскі раён) і пяску — Хаціслаўскае Заходняе (Маларыцкі раён). Першае плануецца выкарыстоўваць для вырабу базальтавых нітак, мінералаватных пліт, тратуарнай плітак, другое — у нафтаразведцы. Гэтыя знаходкі дазваляюць поўнасцю адмовіцца ад адпаведнага імпарту.

Пабыць метэаролагам і сартавальнікам

Адначасова з канферэнцыямі і круглымі сталамі ў гарадскім парку працавалі інтэрактыўныя пляцоўкі «Зялёныя школы», арганізаваныя Рэспубліканскім цэнтрам экалогіі і краязнаўства. Наведвальнікам былі прапанаваны дзіцячыя і падлеткавыя навукова-даследчыя праекты, выстава дасягненняў розных эка-аб'яднанняў, інавацыйныя гульні і майстар-класы. Так, можна было паглядзець на мурашыную ферму і домік для зімоўкі розных казюлек, прыняць удзел у гульні на хуткасць сартавання смецця, праверыць узровень ведаў на экаквізе «Кліматычныя выклікі і рашэнні», паспрабаваць самастойна скласці пуцявую карту МУР (з мерамі па іх рэалізацыі). Нават адчуць сябе метэаролагам: самастойна правесці аналіз якасці вады, паветра, зрабіць іншыя метэавымярэнні на мабільнай станцыі надвор'я «ТАКМЕТ». Інтэрактывы ўпадабалі не толькі ўдзельнікі форуму, але і мясцовыя жыхары — некаторыя пляцоўкі выклікалі такі ажыятаж, што было цяжка нават проста паглядзець, што адбываецца на тым ці іншым стале.

Небяспечныя адходы, папулярныя рыбы і рэдкія расліны

На другі дзень форуму прайшоў круглы стол, прысвечаны ў асноўным абыходжанню з небяспечнымі адходамі, іх уздзеянню на здароўе чалавека і навакольнае асяроддзе, умовам збору, захоўвання і перапрацоўкі, асаблівасцям уліку даных пра цяжкія арганічныя забруджвальнікі ў краіне. Аднак на мерапрыемстве таксама былі абмеркаваны некаторыя аспекты барацьбы са зменамі клімату і ўнёскам нашай краіны ў выкананне мэт Парыжскага пагаднення.

Падчас форуму адбылося зарыбленне вадасховішча Дубянецкае (Вялікія Арлы). Яно карыстаецца вялікай папулярнасцю сярод мясцовых рыбаловаў, таму папуляцыя рыбы не паспявае аднаўляцца. Своечасовая дапамога прыйшла ў асобе профільных ведамстваў, накшталт Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў, прадстаўнікі якога і запусцілі сумесна з Мінпрыроды ў вадаём белых амураў, таўсталобікаў, самоў, шчупакоў.

Яшчэ адна цікавая экалагічная акцыя — адкрыццё заказніка мясцовага прызначэння «Пойма Льва» (плошча — 2399,4 га), які павінен забяспечваць дзейсную ахову ўнікальнага для Беларускага Палесся лесабалотнага комплексу. Менавіта тут жывуць пяць відаў чырванакніжных птушак (вялікі грыцук (кулік), драч, белая сініца, чапля-лазянік, валасянка-белашыйка), а таксама знаходзяцца біятопы двух відаў раслін — гарлачык белы і сальвінія плавальная.

Фінальным акордам XVII Рэспубліканскага экалагічнага форуму стаў фестываль коней «Палеская ніва — 2023» у аграгарадку Рэмель (Столінскі раён). Дарэчы, на пачатку ўрачыстай цырымоніі лінуў даволі моцны дождж, але нават кепскае надвор'е не сапсавала падвядзення вынікаў мераприемства. Андрэй Худык падзякаваў прадстаўнікам улады Брэсцкай вобласці і Столінскага раёна, таксама ад імя ўсіх дэлегатаў форуму звярнуўся да сусветнай грамадскасці з заявай аб недапушчальнасці ўмяшання палітыкі ў экалогію, абмежавання правоў чалавека на экалагічнае, здаровае і ўстойлівае навакольнае асяроддзе, а яшчэ заклікаў да неадкладнага аб'яднання намаганняў усіх краін свету для зніжэння негатыўнага ўздзеяння чалавека на ключавыя экасістэмы Зямлі ў мэтах іх хуткага аднаўлення. Гэты зварот будзе накіраваны ў міжнародныя арганізацыі і сакратарыяты міжнародных дагавораў у галіне аховы навакольнага асяроддзя, рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў і змякчэння наступстваў змен клімату.

Александрына ПАРШЫНА.
Фота Андрэя КАРАБЕЛЬНІКАВА.

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона)
(место нахождения:
г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321, тел. 017 516-80-61)
по поручению
минского районного унитарного предприятия
«Агрокомбинат «Ждановичи» (продавец)
(место нахождения:
ул. Вышелесского, 2, 220063, г. Минск, тел. 017 516-88-61)
проводит открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ НЕИСПОЛЬЗУЕМОГО НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА,

расположенного по адресу: г. Минск, ул. Брикета, 37, одним лотом в составе:

- **сооружение теплица зимняя с рассадным отделением, инв. № по бух. учету 711;**
- **сооружение теплица зимняя б/рассадного, инв. № по бух. учету 712;**
- **корпус бытовых и подсобных помещений, инв. № по бух. учету 4605;**
- **склад с инв. № 500/С-41585 (инв. № по бух. учету 4603);**
- **пункт ядохимикатов, инв. № по бух. учету 4615.**

Продажа недвижимого имущества осуществляется **для последующего сноса без изъятия земельного участка** с кадастровым номером 500000000006007774, на котором расположено недвижимое имущество, **и без предоставления его победителю аукциона** либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

Начальная цена без НДС– **1 190 954,14** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены **– 119 095,00** бел. руб.

Аукцион состоится **17.10.2023** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **13.10.2023** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11. Тел. для осмотра (8044) 585-09-38.

Извещение о торгах опубликовано на сайтах:
rlt.by, au.nca.by, minsk-region.gov.by.

УНН 600049705

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона)
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего
ОАО «Несвижский райагросервис»

Аукцион состоится **02.10.2023 в 11.00** по адресу:
г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1:

ЗДАНИЕ ВОЙНИЛОВИЧСКОГО СЕЛЬСКОГО КЛУБА,

инв. № 621/С-1026087, 219,1 кв. м.

Адрес: Минская обл., Несвижский р-н, Несвижский с/с, д. Войниловичи, ул. Несвижская, 21.
Земельный участок 624283501101000161, 0,3502 га.
Право постоянного пользования.

Начальная цена с НДС 20 % – 64 120,00 руб.
Задаток – 6 000,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений и задатка – **28.09.2023 г. в 11.00.**

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

25.09.2023 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:

1) О локальных нормативных актах общества.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Белорусская, 51.

Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

Дата сбора реестра акционеров – 15.09.2023 г.

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни начиная с 18.09.2023 г. (с 14.00 до 15.00) по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

УНП 200050191

РУП «Институт недвижимости и оценки»
(Гродненский филиал)

ИНФОРМИРУЕТ
о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу филиал «Центральный рынок»

Аукцион состоится 11.10.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71

Лот № 1	
Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона	ЛОТ 1: - капитальное строение с инвентарным номером 400/С-7508 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), общей площадью 956,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 55; - капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129622 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – тепловая сеть) протяженностью 24,7 м, расположенное по адресу: г. Гродно, тепловая сеть к зданию магазина по ул. Максима Горького, 55; - капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129623 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть) протяженностью 57,6 м, расположенное по адресу: г. Гродно, водопроводная сеть к зданию магазина по ул. Максима Горького, 55; - капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129625 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть) протяженностью 190,3 м, расположенное по адресу: г. Гродно, водопроводная сеть к зданию туалета по ул. Максима Горького, 55; - капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129624 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть) протяженностью 159,7 м, расположенное по адресу: г. Гродно, канализационная сеть к зданию магазина по ул. Максима Горького, 55; - капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129627 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть) протяженностью 26,8 м, расположенное по адресу: г. Гродно, канализационная сеть к зданию туалета по ул. Максима Горького, 55; - сеть энергоснабжения; - оборудование: вагончик строительный, комплект регулирования температуры, набор мебели, насос «Грундфос» УРС24*40, охранно-пожарная сигнализация, павильон из металлоконструкций, регулятор распределения тепловой энергии, регулятор расхода теплоэнергии МИР 9701, система видеонаблюдения, система пожарной сигнализации; теплосчетчик ТЭМ-104 Ду-15; торговое оборудование (стеллаж, стол для торговли); торговый павильон (5 шт.); торговый павильон 3,2 м (2 торговых места 1,6*1,6); кондиционер настенный (2 шт.); лифт грузовой; пожарная сигнализация; холодильная камера GOLD; холодильная камера-склад. Лот 1 имеет обременения со стороны третьих лиц в виде аренды с собственниками павильонов и мест для торговли; прохождение по территории рынка теплотрассы к зданию ООО «Фирма Мока», на которой расположены павильоны и роллеты, в том числе находящиеся в собственности арендаторов
Начальная цена продажи	1 606 929,60 руб. (один миллион шестьсот шесть тысяч девятьсот двадцать девять рублей шестьдесят копеек) с учетом НДС
Сумма задатка	160 692 руб. (сто шестьдесят тысяч шестьсот девяносто два рубля)
Реквизиты для перечисления задатка	BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225
Место, дата и время окончания приема заявлений	Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208 с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 09.10.2023 г. до 15.00**
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 28.12.2022 г.	
Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsionykopiya/	

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению **Добрушского РайПО** (продавец) извещает о проведении **26 сентября 2023 года** повторного открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

Предыдущая публикация 29.08.2023 г.

Лот № 1: кап. строение с инв. № 311/С-51753, площадью 1063,7 кв. м, наименование – мебельный склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, расположенное на земельном участке с кадастровым № 321250100002000395 площадью 0,5738 га, расположенное по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Плеханова, 11А
Кап. строение с инв. № 311/С-30479, площадью 856,5 кв. м, наименование – овощехранилище, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, расположенное на земельном участке с кадастровым № 321250100002000395 площадью 0,5738 га, по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Плеханова
В лот входит оборудование 17 ед., список на сайте www.deloocenka.by
Начальная цена продажи без НДС – 78 200,00 бел. руб. **Задаток** – 250,00 бел. руб.
Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права на предмет аукциона возлагаются на Победителя аукциона

Продавец: Добрушское РайПО, г. п. Тереховка, ул. Вокзальная, 47. Конт. тел. +375 29 690-00-10.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 25.09.2023 г. в 17.00.

Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения. Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в сроки согласно заключенному договору купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Конт. тел. организатора аукциона:
+375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62.

ООО «СпецРеализация»

объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – ООО «Белнефтетранзит»

(УНП 191750278, г. Минск, ул. Украинская, 27-9а).

***Дата и время проведения торгов*: 18 октября 2023 года.**

Начало – 10.00. Заявки принимаются с 16 сентября 2023 года по 16 октября 2023 года.

Место проведения торгов: Минск, пр-т Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

Организатор торгов: ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

Продавец: **ООО «Белнефтетранзит» (УНП 191750278)** в лице ликвидатора – директора ООО «АзимутКонсалт» Радченко К.И., тел. 8 (029) 156-86-96.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 2 %.

Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интернет-сайте http://www.specrealization.by.

Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375291568696, Радченко Кирилл Игоревич; +375296847176, Яскевич Дмитрий Васильевич.

Извещение о проведении открытого аукциона по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома **в д. Старый Лепель, ул. Радужная, 35**

Организатор: Стайский сельский исполнительный комитет

№ лота	Вид аукциона, целевое назначение	Месторасположение земельного участка, площадь и кадастровый номер	Условия и ограничения	Предварительные расходы по подготовке и изготовлению документации, рублей	Начальная цена, рублей	Сумма задатка, рублей
1	В частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	д. Старый Лепель, ул. Радужная, 35, площадь 0,15 га, кадастровый номер 222783608601004460	- земельный участок расположен на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранных зонах рек и водоемов) озеро Лепельское; - получение победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство	2804,42 плюс расходы на рекламу	5000,00	500,00

1. **Аукцион состоится 23 октября 2023 года в 14.30 по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, аг. Стаи, ул. Лепельская, д. 12.**

2. Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, аг. Стаи, ул. Лепельская, д. 12.

Последний день приема заявлений – 18 октября 2023 года до 17.00.

3. К участию допускаются граждане РБ, подавшие заявление установленной формы, внесшие задаток в размере 10 % от начальной цены объекта аукциона на расчетный счет BY83AKBB36413191010342100000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300039704. **Получатель – Стайский сельский исполнительный комитет**

4. Для участия в аукционе необходимо предоставить копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенную доверенность, а также предъявляется паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, и копии платежных документов, подтверждающих уплату задатка.

5. Не допускается начало торгов по начальной цене.

6. Оплата стоимости предмета аукциона, расходов по организации и проведению аукциона, расходов по подготовке и изготовлению документации, расходов на публикацию в средствах массовой информации, подлежащих возмещению победителем, осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении (передаче в частную собственность) победителю аукциона земельного участка.

7. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами и земельным участком в натуре.

Контактные телефоны: 8 (02132) 3-25-42; 3-25-74; 8 (029) 309-33-58 (А1).

УНП 300039704

ЗА ДВУМА ЗАЙЦАМІ

Як выжыць у рэжыме шматзадачнасці

Так ужо склалася, што новы працоўны год большасць з нас прывыкла пачынаць зусім не са студзеня, а якраз з верасня. Лета скончылася, адпускны настрой застаўся ў мінулым, і надышоў час сур'ёзна брацца за працу. А гэта значыць, хочаш не хочаш, а зноў вяртацца да рэжыму шматзадачнасці. Асабліва калі ў вас ёсць дзеці школьнага ўзросту: думаю, не памылюся, калі скажу, што пачатак верасня мамы і таты, дзядулі і бабулі таксама ўспрымаюць як «новы пачатак». І каб усё паспяваць, трэба, як Юлій Цэзар, навучыцца рабіць некалькі спраў адначасова.

Вось толькі ці правільна гэта? Яшчэ нядаўна ўменне выжываць у рэжыме шматзадачнасці лічылася карысным навыкам і яму нават навучалі на анлайн і афлайн-курсах рознага роду «гуру» і коўчы. Радок пра шматзадачнасць лічылася добрым тонам дадаць у рэзюмэ пры працаўладкаванні. Сёння псіхолагі гавораць, што эфектыўная шматзадачнасць — гэта ілюзія: імкненне рабіць некалькі спраў адначасова негатыўна адбіваецца на якасці выканання кожнай з задач і ў канчатковым выніку прыводзіць да неўрозу. Аб тым, як выжыць у рэжыме шматзадачнасці, мы спыталі ў **практыкуючага псіхолага Кацярыны ЗЫЧЫНАЙ.**

Амаль як Юлій Цэзар

— Кацярына Аляксееўна, чаму сёння шматзадачнасць — то-бок уменне спраўляцца адначасова з некалькімі справамі — ацэньваецца псіхолагамі хутчэй са знакам «мінус»? Раней гэтае ўменне лічылася абавязковым для сучаснага чалавека...

— Практыкуючыя псіхолагі ніколі не ацэньвалі так званую шматзадачнасць, так бы мовіць, са знакам «плюс». Справа ў тым, што на практыцы, спрабуючы быць шматзадачнымі, мы займаемся хуткім пераключэннем паміж задачамі, кожная з якіх кідаецца на палове дарогі, каб вярнуцца да пакінутай раней папярэдняй або пачаць рашэнне наступнай. Гэта не дае нам засяродзіцца, спакойна давесці пачатае да лагічнага завяршэння. У выніку на рашэнне кожнай задачы патрабуецца больш часу, чым калі б вы займаліся ўвасабленнем у жыццё пастаўленых мэт па чарзе. Плюс назапашваецца псіхалагічная стомленасць, узнікае непакой і трывога — на жаль, гэта фон жыцця сучаснага чалавека. Пастаянная спешка спараджае незадаволенасць. А ўсе задачы ў «рэжыме шматзадачнасці» вырашаюцца так-сяк: такім чынам, ваша эфектыўнасць падае. Калі вы адначасова спрабуеце, дапусцім, пісаць працоўную справаздачу, смажыць катлеты і правяраць у дзіцяці ўрокі, то, напэўна, заблытаецеся ў лічбах і высновах (і, каб разабрацца, дзе памылка, запатрабуецца час, які вы якраз і жадалі сэканоміць). Катлеты падгараць, а няздольнасць дзіцяці самастойна разабрацца з «дамашкай» выкліча раздражненне і прывядзе да сваркі. Пасля гэтага вы пачняце лаяць сябе, што дрэнная маці (або бацька) і нікчэмны працаўнік, гэта выкліча пачуццё незадаволенасці сабой і трывогі — і ўсё закруціцца ў замкнёным коле...

А наогул шматзадачнасць — не вынаходства трэцяга тысячагоддзя. Мара аб здольнасці рабіць мноства спраў адначасова хвалюе людзей спрадвеку. Прыгадаем хоць бы Юлія Цэзара, на якога арыентуюцца «шматзадачнікі»... Ёсць такая старажытная прытча. Да знакамітага майстра каліграфіі прыйшоў прасіцца ў вучні юнак. Ён убачыў пажылога чалавека, які варыў рыс. «Вы знакаміты майстар?» — спытаў ён. «У дадзены момант я чалавек, які памешвае рыс», — адказаў мудрэц. Шматзадачнасці тут супрацьпастаўляецца прынцып адназадачнасці. І я цалкам за гэты прынцып.

— Значыць, наш мозг не здольны апрацоўваць больш за адну задачу ў пэўны момант?

— Гэта не зусім так. Наш мозг увесь час працуе ў шматзадачным рэжыме. Напрыклад, калі чалавек чытае пост у інтэрнэце, то адначасова апрацоўвае інфармацыю, разумее сэнс, стварае ва ўяўленні візуальныя вобразы, ацэньвае дакладнасць прапанаванай інфармацыі і выпрацоўвае ўласнае стаўленне да прачытанага. Магчыма, нават прыдумляе, што напісаць у каментарыях да гэтага паста. Пры гэтым мы заўважаем гукі і пахі, абстаноўку вакол нас, адзначаем, хто ўвайшоў у пакой, дзе мы сядзім, і хто з яго выйшаў. А калі чытаем у транспарце, то, як бы цікава ні было, не прапусцім свой прыпынак. Гэта значыць наш мозг выконвае тысячы аперацый у кожную хвіліну часу. Але з большасцю задач ён спраўляецца, так бы мовіць, у «рэжыме аўтапілота», выводзячы на першы план нешта галоўнае на дадзены момант. Характэрны, хоць і негатыўны прыклад, сварка са сваёй другой палоўкай (мужам або жонкай) у месенджары падчас кіравання аўтамабілем, калі паведамленні кіроўца піша, спыняючыся на чырвонае святло. Усё роўна на першым плане для кіроўцы будзе дарожная абстаноўка — хоць, паўтаруся, гэта вельмі негатыўны прыклад, таму што ўвага рассейваецца, а гэта небяспечна. Такім чынам наш мозг увесь час працуе ў рэжыме шматзадачнасці. І вось вам пытанне: ці разумна нагружаць яго дадатковымі — прычым часам неабавязковымі — задачамі. А мы гэта робім пастаянна. Прыйшоўшы на працу, наўрад ці сучасны чалавек можа вырашаць працоўныя пытанні хоць бы паўгадзіны, не адцягнуўшыся на праверку паведамленняў у месенджарах і электроннай пошты. Працуючы за камп'ютарам, мы раз-пораз адцягваем увагу на сёрфінг у інтэрнэце, лезем на YouTube або заходзім у «Інстаграм». Калі муж расказвае ўвечары, як прайшоў дзень, мы, хутчэй за ўсё, утыкаемся ў смартфон са словамі: «Ды слухаю я, слухаю!» Нават размаўляючы па тэлефоне з найлепшай сяброўкай, адначасова мы, напрыклад, фарбуем пазногці. Або думаем на ранішняй працоўнай планёрцы не аб тым, што нам кажуць, а аб старонніх рэчах: «А я выключыла прас?» Для многіх норма — не даслухаўшы да канца рэпліку свайго візаві, дадумваць за яго тое, што ён хоча сказаць, і — «я ўжо ўсё зразумеў!» — пачынаць адказваць. Псіхіка сучаснага чалавека адчувае пастаянныя перагрузкі, бо мы спрабуем уціснуць у кожную гадзіну нашага дня дзясяткі спраў. Адсюль — усе тыя праблемы, з якімі і прыходзяць да псіхолага. Напрыклад, пракрастынацыя (схільнасць адкладаць справы, якая прыводзіць да псіхалагічных праблем). Нездольнасць доўга канцэнтравацца на нейкай задачы. Асабліва калі гэтая задача патрабуе ўдумлівасці, спакою і ўвагі на працягу доўгага часу. Невыпадкова сучасныя падлеткі аддаюць перавагу коміксам замест сур'ёзнай літаратуры. Педагогі кажуць аб «кліпавай свядомасці», але гэта ўласціва не толькі моладзі, але і дарослым у наш час. Адсюль псіхалагічная прыгнечанасць і «выгаранне» — калі ўжо з раніцы мы адчуваем сябе стомленымі: «Я нічога не хачу» або «Хай мяне не чапаюць». Адсюль — нядбайнасць, забыўчывасць, якая часам здзіўляе самога чалавека: «Я ж хацеў усё зрабіць добра...»

— Чаму так адбываецца?

— Гэта фізіялогія. Так працуе наша ўвага. Калі тлумачыць проста, эфектыўнае кіраванне увагай працуе так. Першы этап — факусіроўка. Наш мозг ацэньвае абстаноўку і выбірае, на чым сканцэнтравацца. Наступны этап — утрыманне: канцэнтрацыя на абраным элеменце або задачы на працягу нейкага часу без стомленасці і жадання ўсё кінуць і задрамаць. Яшчэ адзін працэс, які мае дачыненне да ўвагі, ігнараванне: мы засяроджваемся на нейкай мэце і не адцягваемся на іншыя. І нарэшце, пераключэнне — завяршыўшы рашэнне адной задачы, мы пераходзім да рашэння наступнай, якая патрабуе нашай увагі. Ёсць яшчэ падзел увагі — і гэта якраз пра шматзадачнасць. Гэта здольнасць працаваць над дзвюма ці трыма задачамі адначасова. Але даследаванні апошніх гадоў дакладна паказалі, што рэзультатыўнасць у гэтым выпадку сур'ёзна пакутуе. Справа ў тым, што ўвага паміж дзвюма задачамі не дзеліцца пароўну, гэтыя суадносіны — 70 на 30 %. Таму рэжым шматзадачнасці апраўданы, толькі калі другую справу мы выконваем «на аўтамаце». Напрыклад, павольна шпацыруем па скверы, слухаючы аповед сяброўкі аб падзеях у яе жыцці. Або ўключаем музыку падчас прыборкі дома. Для прыкладу прадставім нашу ўвагу ў выглядзе праменя яркага святла ў цемры. На што падае святло, тое і знаходзіцца ў цэнтры ўвагі. Прамень можа асвятліць і нейкія прадметы побач, але не дакладна: выразна мы бачым толькі тое, на што канкрэтна накіроўваем святло. Калі ж кожная са спраў патрабуе стопрацэнтнай увагі, то, як я ўжо казала, мы прымушаем наш мозг хутка пераключацца з задачы на задачу (так званая серыйная шматзадачнасць). Напрыклад, гаворачы па тэлефоне з кліентам, просім яго пачакаць, каб праверыць рабочую пошту і прачытаць дакументы, якія вам даслалі, а потым вяртаемся да перапыненай размовы. Такое пераключэнне патрабуе ад нашага мозгу вялізных энергетычных затрат.

Менш, ды лепш

— Такім чынам, шматзадачнасць нельга назваць каштоўным навыкам?

— Я сказала бы, гэта адна з распаўсюджаных праблем сучаснага чалавека. На гэтым трэба сябе лавіць і паступова адвучвацца. Нанова асвойваць амаль згубленае ў сучасным свеце ўменне засяроджвацца на адной справе больш за дзесяць хвілін. Нават калі сумна і рукі самі цягнуцца да смартфона, ноўтбука або пульта тэлевізара. Калі вы за рулём, засяродзьцеся на дарозе. Не трэба адказваць па тэлефоне, балбатаць з пасажырамі, пераключаць FM-станцыі ў пошуку музыкі ці навін. Тады ўвага не будзе рассейвацца і, калі так будуць рабіць усе, ДТЗ стане менш. Калі вы ясце — не трэба адначасова глядзець серыял. Засяродзьцеся на сваёй талерцы і смакавых адчуваннях. Вы заўважыце кожны з'едзены кавалачак і не прапусціце пачуццё насычэння, а значыць, з'ясце ў разы менш, чым праглынулі б за камп'ютарам, нават не заўважыўшы. Карысць і для псіхікі, і для постаці. Дапамагаеце дзіцяці з урокамі? Займайцеся толькі гэтым на працягу выдзеленага на дадзеную задачу часу. У гэтым выпадку знікне звыклае раздражненне, а школьнік хутчэй зразумее тое, што вы яму тлумачыце. І, нарэшце, вырашаючы прафесійныя задачы, займайцеся толькі імі. І вы ўкладзяцеся ў працоўныя гадзіны: не прыйдзецца заставацца звышурочна, каб завяршыць справы або браць работу дадому.

Ну, а калі вы выбраліся на прыроду з сябрамі, не варта абдумваць працоўныя праблемы і разважаць аб тым, што не зроблена дома. Пагадзіцеся, часта бывае так: у адпачынку чалавек не адпачывае, а хвалюецца аб працоўных момантах — а часам і працягвае аддалена выконваць — спехам і так-сяк, пад крыкі чаек і плёскат хваль — працоўныя задачы. А вярнуўшыся на работу, не адчувае, што адпачнуў, шкадуе аб дрэнна праведзеным адпачынку і марыць аб наступным. Такім чынам, рэжым шматзадачнасці не дае нам ні эфектыўна працаваць, ні ад душы адпачываць — таму ад гэтай шкоднай звычкі лепш пазбавіцца.

— Можа здацца, што, выбіраючы адназадачнасць замест шматзадачнасці, мы нічога не будзем паспяваць...

— Гэта распаўсюджанае памылковае меркаванне. Здаецца, што, калі мы робім дзве справы адначасова, на кожную марнуем удвая менш часу. Але даследаванні паказалі, што ўсё якраз наадварот: у рэжыме шматзадачнасці час і затрачаныя намаганні на выкананне кожнай задачы ўзрастаюць прапарцыянальна колькасці задач, якія выконваюцца адначасова. Калі задачы дзве — удвая, калі тры — утрая на кожную. Плюс падзенне рэзультатыўнасці кожнай з вашых адначасовых спраў. Гэта не значыць, што трэба, як робат, усё рабіць строга па чарзе. Наш мозг — складаны і вельмі эфектыўны «камп'ютар». Калі падчас гатавання вячэры вам прыйшла ў галаву выдатная думка, якая датычыцца працы, — што ж, запішыце яе. Але не кідайцеся адразу ж правяраць і дапрацоўваць ідэю, вярніцеся да яе, калі суп будзе звараны. Шматзадачнасць, паўтаруся, дапушчальная, калі на другую справу хопіць і 30 % вашай увагі. У астатніх выпадках больш разумнай і эфектыўнай будзе адназадачнасць.

— Як на практыцы пазбавіцца ад дрэннай звычкі жыць «у рэжыме шматзадачнасці»?

— Перш за ўсё, неабходна дакладнае планаванне. Можна з раніцы складаць спіс задач на дзень (лепш — з указаннем часу, які вы плануеце выдзеліць на тую ці іншую задачу). Можна трымаць гэты спіс у галаве, але лепш усё ж напісаць, візуалізаваць яго. Прытрымлівайцеся складзенага плана, не адхіляйцеся на пабочныя задачы, і вы здзівіцеся, колькі ўсяго пачнеце паспяваць. Асвойце навык казаць «не». Спачатку — вашыя ўласныя задачы, потым — дапамога іншым. Паверце, увайшоўшы ў рэжым адназадачнасці, вы паступова вызваліце час і на тое, каб займацца яшчэ нечым, акрамя бягучых задач. І тады ўжо вырашыце, на што яго выдаткаваць: магчыма, на адпачынак, а можа быць, на дапамогу калегу ці сяброўцы. Прыцягвайце іншых. Школьнік можа схадзіць са спісам у краму або сам сабрацца раніцай у школу, калі вам трэба прыйсці на працу крыху раней. Навучыце дзіця гэтым навыкам — і вы вызваліце ўласны час. Муж здольны прыгатаваць вячэру сам — паспрабуйце наладзіць так сваё жыццё, і вам стане прасцей. І самае складанае: прыкладзіце намаганні, каб навучыць уласны мозг не адцягвацца, займаючыся рашэннем адной канкрэтнай задачы, хай нават гэта напачатку здаецца сумным. Наш мозг паддаецца трэніроўцы, як, скажам, і мышцы прэса ці біцэпс. Вядома, што любую звычку (як дрэнную, так і добрую) можна набыць за 21 дзень, калі штодзень працаваць над ёй. І калі адназадачнасць увойдзе ў лік вашых добрых звычак, вы станеце больш спакойнымі і эфектыўнымі як на працы, так і ў паўсядзённым жыцці.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Вершы, што вырваліся з-за кратаў

Кнігі паэтаў Заходняй Беларусі, напісаныя ў зняволенні

«Ці доўга аб даўнім
сны сніць у палоне?
Хто скажа?
Гады праплывуць...
Калі не загіну, —
усё буду помніць,
І ты, жывучы, не забудзь».

Гэтыя радкі складаў малады паэт Валянцін Таўлай у 1929 годзе, седзячы ў Слонімскім астрогу і марачы аб вольнай Беларусі...

Да вызвалення Заходняй Беларусі з-пад польскай акупацыі было яшчэ дзесяць гадоў... І Дзень яднання, 17 верасня 1939 года, набліжалі не толькі палітыкі і вайскоўцы, але і паэты. Давайце ўспомнім гэтых людзей і іх кнігі, якія нараджаліся ў няволі.

«Я СЫН ГАЛОТЫ І ЦЯМРЫ»

А пачнём з паэта, які сёння сярод літаратараў таго часу, напэўна, не ўспрымаецца самым значным. Але пачытаем артыкул у сакавіцкім нумары 1936 года віленскага беларускага часопіса «Шлях моладзі» пра вечар беларускіх маладых паэтаў у Віленскім універсітэце, які адбыўся 15 сакавіка 1936 года, — падзея для беларускай супольнасці, бо ўсё, што тычылася беларускай культуры, уціскалася ці ўвогуле забаранялася.

Там гаворыцца: *«Міхась Машара — наш слаўны Міхась. Хто яго цяпер не знае. Ён сёння першы пачынае паход маладняку. Ён сёння цешыцца сярод шырокіх беларускіх грамадскіх кругоў найбольшай папулярнасцю. Міхась Машара, сялянскі сын з Дзісненскага павета, з мазалямі на руках, а з агнём і чулай душой у грудзях — гэта вялікі талент і перадавік маладой беларускай паэзіі».*

Пазначаецца: «Дасюль Машара мае ўжо выданых 7 кніжыц». І гісторыя першай з гэтых кніжыц унікальная! Бо нарадзілася за кратамі. За ўдзел у беларускім вызваленчым руху юны Машара трапіў у турму Лукішкі. Там перапісваўся з беларускай дзяячкай Людвікай Войцік, дасылаў ёй вершы. Вось Людвіка і сабрала тыя вершы, адрэдагавала, і ў 1928 годзе з'явіўся на свет першы зборнік Машары «Малюнкі» — у ім было ўсяго 14 вершаў, напісаных за кратамі.

Я сын галоты і цямры,
Паўстаў я з поту і крыві.
Я шэрай, ціхай вёскі сын,
Уладар палёў, лугоў, далін.
Мае дзяды — згіналі каркі,
Цярпелі здзек
і ласку палкі.
Хачу ўзысці
на шлях другі —
Я сын галоты і цямры.

Цікава, што калі пасля зняволення ў Лукішках Машара вярнуўся дахаты — страшны, худы, то, па ўспамінах сястры, да яго прыехалі нейкія паны з Варшавы і пачалі ўгаворваць, каб ён паехаў у Варшаву і пісаў па-польску. Але паэт адмовіўся ад абяцанага добрага жыцця. А ў верасні 1939-га ён быў абраны дэпутатам Народнага сходу Заходняй Беларусі, дзе было абвешчана аб утварэнні адзінай беларускай рэспублікі.

«ГЭТА ЎЖО ЭТАП АПОШНІ, — ЗАЎТРА ЎСТАНЕМ!»

У тым жа артыкуле пра вечарыну беларускіх маладых паэтаў у 1936 годзе згадваецца і Максім Танк, але наступным чынам: «З'яўляецца ён паэтам пачынаючым, але вялікіх здольнасцяў».

Праўда, пасля выступлення пачынаючага паэта захопленыя слухачы паднялі яго на рукі. І ён пры гэтым думаў адно: ці вытрымаюць ягоныя старыя штаны?

Нам цяжка ўявіць Танка маладым дзёрзкім хлопцам Яўгенам Скурко, яшчэ ніякім не класікам, якому новыя штаны няма за што набыць. Але сапраўды: у 1936 годзе ў яго выйшаў толькі першы паэтычны зборнік «На этапах». Але жыццёвы досвед за гэтым зборнікам быў важкі. Увайшлі туды вершы, напісаныя ў зняволенні.

«Гразнуць змораныя ногі
У каляінах...
— Што, этап яшчэ
далёка? —
Раны востра забалелі.
.....
Мы ідзем у час найгоршы
Смерці, волі
на спатканне?
Гэта ўжо этап апошні, —
Заўтра ўстанем!»

Максім Танк успамінаў пра тую першую сваю кнігу: *«Ёсць вершы, якія я напісаў за дзесяць хвілін. Напрыклад, «Памёр стары лірнік...». У час выдання зборніка «На этапах» мне Р. Шырма гаворыць: там трэба вырэзваць чатыры ці пяць старонак, столькі застаецца пустой паперы. Я за адзін вечар*

напісаў тады некалькі вершаў — шкада было вырэзваць...»

На другі ж дзень па выхадзе цэнзура канфіскавала зборнік. Удалося выратаваць толькі 200 асобнікаў. Аўтар жа схапіў з друкарні два зборнікі, занёс на пошту і выслаў у Мінск, Купалу і Коласу.

«ПІЛУЮ ВЕРШАМ КРАТЫ»

А гэты паэт стаў аўтарам першай кніжкі фактычна ўжо ў чатырнаццаць гадоў — сапраўдны вундэркінд... Вось толькі быў ён беларусам, які жыў у панскай Польшчы, пісаў на беларускай мове і слухаўся запавету свайго бацькі — не цурацца роднай мовы і заставацца беларусам. Таму ягоны талент быў для акупацыйных уладаў вялікай небяспекай. Паэму «Непераможаная» вучань Віленскай беларускай гімназіі Валянцін Таўлай напісаў з нагоды суда над кіраўнікамі Беларускай сялянска-работніцкай грамады. Паэму надрукавалі ў вучнёўскім часопісе «Золак» № 1 за 1928 год з подпісам «Янка Дванаццаты». Потым яна была выдадзена на шапірографе асобнай брашурай. Твор пераходзіў з рук у рукі, яго чыталі, дэкламавалі на сходах. А юны аўтар у той год за ўдзел у вучнёўскай забастоўцы быў выключаны з гімназіі і пад паліцэйскім канвоем адпраўлены да бацькоў. А потым першы раз апынуўся ў турме. У вязніцы, і ў першай, і ў наступных, Валянцін Таўлай таксама пісаў вершы, крадма, хаваючыся ад наглядчыкаў, трымаючы ў памяці радкі. Па ўспамінах аднаго з таварышаў, *«працэс «запісвання» адбываўся так. Бывала, Валянцін адарвецца ад будзённых спраў і, заклаўшы рукі назад і крыху прыўзняўшы галаву, пачынае хадзіць па камеры. Пяць крокаў туды, пяць — назад. Ходзіць і аб нечым думае, нешта шэпча. Потым сядзе на лаву, бярэ ў рукі каменьчык, прынесены са шпацыра, і чыркае па цэментнай падлозе. Напіша 2-3 радкі і зноў ходзіць. Потым зноў сядае. Зноў піша. І так — радок за радком».*

Калі адбылося вызваленне Заходняй Беларусі, Валянцін знаходзіўся ў гродзенскім астрозе. Пасля вызвалення кожны дзень пакутліва аднаўляў у памяці радкі сваіх вершаў, прыдуманых у зняволенні, як ён казаў, «вытрасаў з галавы», каб скласці, нарэшце, першы паэтычны зборнік. Дапрацоўваў, перажываў, што не ўсё памятае. Але мары пра ўласную кнігу не паспелі здзейсніцца — вайна... Зноў змаганне — на гэты раз з нямецкімі акупантамі. Рукапіс вершаў схаваны ў тайніку ў печы, за цаглінай. Баючыся за лёс твораў, паэт зрабіў у некалькіх экзэмплярах рукапісны зборнік вершаў з сімвалічнай назвай «Шляхі і краты» і аддаў на захаванне таварышам.

Пасля Перамогі Таўлай зноў пачаў працаваць над рукапісам зборніка. Гэта павінен быў быць ужо не проста дэбютны зборнік, а кніжачка «Выбранае». Яна ўбачыць свет у 1947-м... Але паэт так і не паспее патрымаць яе ў руках: перажытае падарвала здароўе, і 27 красавіка 1947 года паэт памёр. Яму было трыццаць тры гады. Вось што ён пісаў у творы «Аб маіх вершах»:

Маякоўскі
па-сяброўску радзіў
Не збываць адразу
вершы з рук:
Напісаў — замкні яго
ў шуфлядзе,
Як адлежыцца —
судзі, здавай у друк.
Не забыцца добрае
парады,
Колькі мог,
і пан мне «дапамог»,
Замыкаючы замест
шуфляды
З вершамі і аўтара
ў астрог...

«ЛЁС, ВІДАЦЬ, НАЗНАРОК МЯНЕ КІНУЎ НА СУМНАЕ ПОЛЕ...»

Калі Таўлай быў пачынаючым паэтам, ён захапляўся вершамі Міхася Васілька. Дужа той быў папулярны ў Заходняй Беларусі, Міхась Васілёк, ён жа — Міхась Касцевіч з вёскі Баброўня. Дзеля яго публікацый сяляне ў складчыну выпісвалі беларускія часопісы і газеты, вывучалі яго вершы на памяць, збіраліся старыя і маладыя на вячоркі, каб пачытаць тыя вершы ўголас.

«Не паэт я — о не,
Нарадзіла мяне,
Маю песню — пакута,
нядоля.
Я ўсяго васілёк,
Лёс, відаць, назнарок
Мяне кінуў
на сумнае поле».

Цікава, што часам ён падпісваўся іншым псеўданімам — Язэп Гром. Што ж, ён быў не толькі лірыкам, але і змагаром за вызваленне беларусаў.

Дарэчы, менавіта Міхаіл Касцевіч паслужыў правобразам Сяргея Крушыны, героя аўтабіяграфічнага рамана Янкі Брыля «Птушкі і гнёзды. Кніга адной маладосці». А літаратуразнаўца Уладзімір Калеснік прыводзіць вядомы факт пра верш Васілька «Як я пана перанёс»: *«У першай рэдакцыі верш называўся «Як я трапіў у камуністы». Паэт Міхаіл Ісакоўскі пачуў яго ад насельніцтва ў часе вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў 1939 годзе і пераклаў на рускую мову як твор народны».*

Першы зборнік Міхася Васілька «Шум баравы» з'явіўся на свет у 1929 годзе дзякуючы славутаму хормайстру і беларускаму дзеячу Рыгору Шырму, які вырашыў падтрымаць малады беларускі талент. Аформіў кнігу мастак Язэп Горыд. Літаратураўзнаўца Уладзімір Калеснік ацаніў гэты зборнік так: *«Ён сведчыў аб выхадзе з гушчы народа таленавітай моладзі, гатовай чэсна служыць нацыянальна-вызваленчай справе». Але польскія жандары кніжку канфіскавалі. Шырма ўспамінаў: «Пасля кожнага вобыску жандармы стараліся ўсяляк прынізіць уражлівага хлопца: «Эй ты, Максім Горкі, кідай пісаць свае вершы, ідзі лепш вазіць гной»... Жандармам не па нутру было, што беларускі «хлоп» смее пісаць вершы, якія з-за адсутнасці беларускага друку больш разыходзіліся ў рукапісах».*

Што ж, гэты зборнік хаця б пабачыў свет, ягоныя асобныя экзэмпляры захаваліся. А другі зборнік, які таксама быў канфіскаваны, знік, і рукапіс знік таксама.

«МЫ ВЫЙШЛІ З ЦЁМНЫХ БРАМ»

«Краіна родная!
Вітай зару збаўлення!
Ўжо мы прыйшлі
з астрожных брам,
Скаваных дум прастор
і радасць вызвалення
Нясём сваім
затужаным братам», — урачыста пісаў Піліп Пестрак, паэт і пісьменнік, у вершы «Заходняй Беларусі», вітаючы яе вызваленне. І меў права: 17 верасня 1939 года выратавала яго і ягоную каханую Анастасію з турмы і нават ад расстрэлу — Анастасіі давялося на свае вочы пабачыць дакумент, у якім загадвалася ў ноч з 17 на 18 верасня расстраляць у гродзенскай турме палітычных зняволеных — жанчын на вачах у мужчын, а потым і астатніх камуністаў і камсамольцаў. Прысуд спазніўся на сорак хвілін — Чырвоная Армія канчаткова вызваліла Гародню.

Піліп Пестрак у польскіх турмах правёў адзінаццаць гадоў. Таварышы ўспаміналі: *«Здаралася, што ў адным кутку камеры цэменту «давяраў» свае эмоцыі Таўлай, а ў другім — Пестрак. А вечарам яны ўжо чыталі свае новыя вершы...»*

У гродзенскай турме, дзе Пестрак пазнаёміўся з будучай жонкай Анастасіяй, таксама «палітычнай», ён адседжваў свой чацвёрты тэрмін. Калі яго катавалі ў паліцэйскім участку за пераход польска-савецкай мяжы, пашкодзілі слых, а праз некалькі дзён ён згубіў валасы. У турме захварэў на сухоты. Пры гэтым вучыў вязняў матэматыцы, гісторыі, граматыцы, пісаў лекцыі, якія рассылаліся па турме. І складаў вершы — занатоўваў іх кавалачкам цэглы на цэментнай падлозе. Меў пры сабе мокрую анучу — каб, калі што, сцерці радкі... Некаторыя вершы з'яўляліся ў нелегальным рукапісным часопісе «Краты», які ствараўся вязнямі ў некалькіх асобніках — Пестрак згадваў, што ён выглядаў як кішанёвы нататнік. На жаль, не ўсё з тых сцёртых вершаў удалося пасля аднавіць у памяці. Так нараджаўся першы паэтычны зборнік Піліпа Пестрака...

І 17 верасня 1939 года не толькі Піліп Пестрак атрымаў волю — але і яго вершы выйшлі з-за кратаў. Зборнік «На варце» пабачыў свет у 1940-м.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Культура без меж

Казанскі тэатр упершыню з гастролямі ў Беларусі

Дні культуры Татарстана ў Беларусі адкрылі спектаклем «Рэвізор» у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы. На мерапрыемстве прысутнічала шмат высокіх гасцей, у тым ліку намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігар ЛУЦКІ і міністры культуры Беларусі і Татарстана.

Міністр культуры Беларусі Анатоль МАРКЕВІЧ на цырымоніі адкрыцця нагадаў усім прысутным, што традыцыя правядзення абменных дзён культуры была закладзена ў 2018 годзе, калі ў Белдзяржфілармоніі прайшоў галаканцэрт майстроў мастацтваў Татарстана.

— Культурныя абмены трывала ўвайшлі ў наша творчае жыццё. Мы памятаем сардэчны прыём нашай дэлегацыі на гасціннай зямлі Татарстана ў 2022 годзе. Беларускія артысты тады паспяхова выступілі ў Казані і Яшкар-Але, — дадаў Анатоль Маркевіч. — Сёння мы прымаем дарагіх сяброў на беларускай зямлі. У Татарстане, як і ў Беларусі, жывуць добрыя і працавітыя людзі. У сённяшнім няпростым турбулентным свеце культурны дыялог набывае асаблівае значэнне.

У сваю чаргу **міністр культуры Татарстана Ірада АЮПАВА** адзначыла, што выбар пляцоўкі для гастроляў казанскага тэатра невыпадковы. Па яе словах, беларускі пясняр быў звязаны з Татарстанам. Там, у вёсцы Пячышчы існуе адзіны ў Расіі музей Янкі Купалы. Таксама Ірада Аюпава дадала, што ў жылах акцёра Васіля Качалава, імя якога носіць тэатр, таксама цякла беларуская кроў, а імя Мікалая Гогаля, аўтара п'есы «Рэвізор», нагадвае аб тым, што сапраўдная культура не мае меж:

— Хоць нас падзяляюць тысячы кіламетраў, мы абсалютна аднолькава адказваем на пытанні, што такое добра і што такое дрэнна. Для нас галоўнымі каштоўнасцямі, як і тысячу гадоў таму, з'яўляюцца сям'я, родная зямля, родная мова, культура і, вядома, сяброўства.

Казанскі тэатр імя В. І. Качалава прыехаў у Беларусь упершыню. **Мастацкі кіраўнік тэатра, народны артыст Расіі і Татарстана Аляксандр СЛАВУЦКІ** адзначыў, што даўно хацеў пабываць у Мінску:

— Мне вельмі спадабаўся горад. Ціха, спакойна, мірна, чыста, прыгожа. Мы рады сустрэчы з вашымі гледачамі.

Па жанры «Рэвізор» — камедыя. Аднак Аляксандр Славуцкі заўважае, што ў іх на радзіме пасля гэтага спектакля людзі выціраюць слёзы:

— Таму што гэта не пра дурняў-чыноўнікаў, а пра трагічны лёс краіны.

Гастролі казанскага тэатра працягнуцца ў сталіцы да 26 верасня. У праграме — такія спектаклі, як «Вар'яцкі дзень, або Жаніцьба Фігара», «Пыл у вочы», «Скрыпач на даху», «Васа», «Баль зладзеяў» і рэтраканцэрт «Калі запаляцца ліхтары».

Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.

Прэм'ера

«ТАК НЕ ПАВІННА БЫЦЬ!»,

альбо Як урокі мінулага засцерагаюць ад памылак у будучыні

Беларускае кіно цяпер мае новую старонку, якая прысвечана гістарычнай драме «На другім беразе», што ўбачыла свет на кінастудыі «Беларусьфільм». Прэм'ера фільма адбылася ў сталіцы і ў кінатэатрах краіны 14 верасня, напярэдадні Дня народнага адзінства. Мы завіталі на паказ у Дом кіно, каб убачыць карціну, прасякнуцца атмасферай мінулага і паразважаць пра самае важнае.

— Я ўпэўнены, што фільм апраўдае ўсе чаканні нашых гледачоў, таму што тэма, закранутая ў ім, вельмі важная для кожнага. Маладыя людзі ўбачаць тое, што адбывалася ў мінулым з нашым народам і краінай. І трэба вучыцца сёння на тых памылках і берагчы сёння наш мір, — адзначыў **генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Юрый АЛЯКСЕЙ**. — Так, у фільме адлюстраваны падзеі мінулага, але яны актуальныя і цяпер, таму што ў розныя перыяды былі спробы раз'яднаць нашу краіну, але беларускі народ заўсёды аб'ядноўваўся і быў здольны адстаяць сваю радзіму.

Перад паказам прысутныя мелі магчымасць адразу ў холе дакрануцца да гісторыі: для гледачоў зладзілі выстаўку з экспанатамі рэквізіту, які быў выкарыстаны ў фільме. Зброя, вопратка, тэлефонны апарат адразу нібыта пераносяць у часы, калі жыццё і побыт выбудоўваліся па сваіх законах.

— Гістарычнае кіно не церпіць эксперыментаў, таму з самага пачатку мы дамовіліся з творчай групай, што ўвасабляем тую гісторыю, якая закладзена ў сцэнарыі. Як рэферэнс мы трымалі для сябе ў галаве такія шэдэўры савецкай кінакласікі, як «Цені знікаюць апоўдні», «Вечны покліч» і іншыя. І рабілі ўсё ад нас залежнае, каб распавесці праўдзіва гісторыю нашых герояў, — распавядае **рэжысёр фільма Андрэй ХРУЛЁЎ**. — Спачатку быў сцэнарый, які доўга перараблялі, узгаднялі, а потым ужо распачаўся здымачны працэс. І на гэтым этапе пэўныя складанасці ўзнікалі якраз з пошукам пляцовак для здымак. Вядома, выдатна, што ў Беларусі ўсё пафарбавана, заасфальтавана, але ў нас дзеянні адбываліся ў 1925 годзе, і таму для кінавытворчага працэсу такія абставіны стварылі пэўныя складанасці. У пошуку лакацый, якія адпавядалі б таму часу, мы аб'ехалі амаль усю краіну. Няпростай была работа нашай групы ў халодныя ночы і начныя змены. Атмасферу мінулага імкнуліся перадаць таксама рэквізітам. Мастакі-пастаноўшчыкі і мастак па касцюмах вывучалі шмат архіўных дакументаў і фотаматэрыялаў: як людзі апраналіся, якім быў іх побыт. Нашы спецыялісты правялі ў гэтым кірунку каласальную працу, і нічога выпадковага ў нас няма. Спадзяюся, удалося дасягнуць сваёй мэты, і глядач адчуе тую эпоху на экране.

Атмасферай сапраўды пранікаешся з першых кадраў, аднак антураж усё ж адыходзіць на задні план. Бо пачынаецца гісторыя з эпізоду адстойвання мясцовым насельніцтвам царквы, якую польскія ўлады вырашылі ператварыць у склад. Супрацьстаянне, у ходзе якога аказваецца за крок ад смерці маці галоўнага героя, дазваляе адчуць адразу несправядлівасць, жорсткасць, прыгнёт, якія былі рэальнасцю для людзей у той перыяд.

— Праца над фільмам была вельмі цікавая, таму што нават напісанне сцэнарыя — гэта шматслойны працэс. Як правіла, ад першапачатковай задумы ў выніку мала што застаецца, і, магу адкрыць сакрэт, у нашым фільме адбылося тое самае. Спачатку ён і пачынаўся іначай, і праблематыку меў зусім іншую. А потым мы сядзелі неяк з аўтарам сцэнарыя Андрэем Крываручкам, накідвалі ідэі, і вось са з'яўленнем сцэны, дзе людзі абараняюць храм, стала ўсё на свае месцы. Здавалася б, адна дэталь, а яна стала найважнейшай і выбудавала логіку ўсёй карціны, — дзеліцца **гісторык Вячаслаў БАНДАРЭНКА**, які выступіў кансультантам кінастужкі. — Калі чытаеш гісторыю на паперы — гэта адно, а вось убачыць, як яна пражываецца акцёрамі на экране, — іншае. Упэўнены, гледачы змогуць пабачыць сапраўдны адрэзак жыцця нашых людзей. Яно было цікавым, месцамі страшным, але тым, якое прымушае чалавека адшукаць сябе сапраўднага і зразумець, кім ён з'яўляецца.

Бачыць чалавечую сутнасць дазваляе ў карціне кожны герой, незалежна ад таго, праяўляе ён сябе станоўча ці адмоўна. Але ж найбольш працягла і глыбока паказана менавіта трансфармацыя галоўнага героя Паўла Смоліча (Данііл Чуп). Гэта бачыш па яго паводзінах, учынках, нават думках, якія ён выказвае на працягу ўсяго фільма.

— Галоўны герой карціны спачатку займае абывацельскую пазіцыю ў адносінах да ўсяго, што адбываецца, а ўжо потым мы назіраем, як ён мяняецца. А ў складаныя часы нельга быць нейтральным, бо гэта здрада. Таму тут мы бачым праблему выбару і пераацэнку сваёй пазіцыі ў галоўнага героя, — дадае рэжысёр Андрэй Хрулёў. — У нас гісторыя пра людзей, але ў фармаце поўнага метра мы не маглі паказаць надта дэтальна жыццё таго часу. Мы толькі прыадкрылі заслону пэўнага перыяду. Можа, тое паспрыяе, каб абудзіць у моладзі інтарэс да вывучэння сваёй гісторыі. І, такім чынам, маладыя людзі, якія лёгка трапляюць пад уплыў розных міфаў, будуць абаронены ад памылак.

З іншага боку, што мы таксама бачым па кінастужцы: толькі памыляючыся, расчароўваючыся, чалавек набывае вопыт, расце як асоба і здольны нешта змяняць у сваім існаванні. Так, да прыкладу, адчуваецца сталенне і сябра галоўнага героя Юрэка (Андрэй Дудко). Спачатку наіўны закаханы хлопец, які гатовы на што заўгодна дзеля свайго пачуцця, а пасля чалавек, які ў імгненне страчвае ўсё: веру, глебу пад нагамі (калі сутыкаецца з падманам тых, каго хацеў лічыць самымі блізкімі) і пераўтвараецца ў адчайнага і рашучага персанажа.

Вельмі важную фразу ў карціне кажа бацюшка (Ігар Падлівальчаў), што чалавек жыве і бачыць сэнс свайго існавання толькі тады, калі ёсць вера і любоў. Страчваючы іх, мы ўжо ніколі не будзем ранейшымі. Але, на шчасце, праз іх набыццё наканавана змяняцца галоўнаму герою фільма. З абыякавага юнака Павел паступова становіцца адказным, мэтанакіраваным і адважным хлопцам.

— Я ўжыўся ў абставіны, у якіх існуе мой герой, дакладна разумеючы, якія ў яго ўзаемаадносіны з іншымі персанажамі, — дзеліцца **акцёр Данііл ЧУП**. — Вядома, каб быць пераканаўчым у кадры, мне даводзілася рэпеціраваць і самому, і з рэжысёрам. Але, думаю, галоўнае, што ў нейкі момант я яму поўнасцю даверыўся і пасля атрымаў тое ж у адказ.

Так, ад гарманічнага ўзаемадзеяння кожнага чалавека ў творчай камандзе і залежыць агульны вынік. У фільме «На другім беразе» гэта адчуваецца ва ўсім. Як зняты агульныя і буйныя планы, прыродныя краявіды, дынаміка кожнай сцэны аператарам Вячаславам Дунаевым, як падкрэслены выразна і аздоблены музычна важныя эпізоды кампазітарам Аляксандрам Сухаравым, як адпрацавана кожная дэталь у інтэр'еры і ў вопратцы мастаком па касцюмах Людмілай Сакаловай, мастаком-пастаноўшчыкам Уладзімірам Раманоўскім, мастаком па рэквізіце Аляксеем Валынцам і вялікай колькасцю тых людзей, якія працавалі за кадрам.

— Гэта мой першы вопыт напісання музыкі да кіно. Працэс быў цікавы, і ўсё ўдалося здзейсніць на працягу двух тыдняў. Можа, таму, што я шмат пішу для мюзіклаў і буйной формы, — распавядае **кампазітар Аляксандр СУХАРАЎ**. — У кіно свой алгарытм стварэння музыкі, таму я вельмі ўдзячны за давер і дапамогу ў працы рэжысёру. У фільме пераплялiся і дэтэктыў, і баявік, і драма, і каханне. Мне трэба было падкрэсліць эмоцыі герояў, моманты неспакою, любові і зрабіць гарманічна, таму прысутнічала хваляванне. Але, спадзяюся, змог дадаць карціне новых фарбаў.

Палітра падзей, характараў у карціне «На другім беразе» сапраўды багатая. Яе варта паглядзець і моладзі, і дарослым. Каб згадаць агульны боль перажытага нашымі продкамі, аціць іх гераізм у імкненні адстаяць сябе, свае правы і каштоўнасці, мову, культуру, веру. І яшчэ, каб зразумець, што ў моманты, калі амаль страчана апошняе, усведамляецца яго цана. Аднак, як сказаў у фінале галоўны герой, так не павінна быць...

Алена ДРАПКО.
Фота дадзена кінастудыяй «Беларусьфільм».

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона: ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by

Продавец: ОАО «Лидахлебопродукт», Гродненская область, г. Лида, ул. Булата, 1. Тел. (0154) 65 25 01

Оператор ЭТП: ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46, www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов:

Лот № 1

Здание зерносклада (здание специализированное сельскохозяйственного назначения), инв. номер 420/С-47036, общей площадью 576,4 кв. м. Адрес: Гродненская обл., Лидский р-н, Дитвянский с/с, 13/5, зерносклад в районе д. Евсеевичи.
Сведения о земельном участке с кадастровым номером 423683200027000031: предоставлен на праве аренды (по 16.05.2072 г.) общей площадью 0,3517 га для строительства и обслуживания здания зерносклада

Начальная цена с НДС 20 %: 8 496,00 белорусских рублей (снижена на 80 %)

Лот № 2

Здание гаража (здание специализированное сельскохозяйственного назначения), инв. номер 420/С-47032, общей площадью 817,5 кв. м. Адрес: Гродненская обл., Лидский р-н, Дитвянский с/с, 13/2, гараж в районе д. Евсеевичи.
Сведения о земельном участке с кадастровым номером 423683200027000026: предоставлен на праве постоянного пользования общей площадью 1,1350 га для обслуживания здания гаража

Начальная цена с НДС 20 %: 3 576,00 белорусских рублей (снижена на 80 %)

Лот № 3

Здание механической мастерской (здание специализированное сельскохозяйственного назначения), инв. номер 420/С-47034, общей площадью 325,3 кв. м. Адрес: Гродненская обл., Лидский р-н, Дитвянский с/с, 13/1, мехмастерская в районе д. Евсеевичи.
Сведения о земельном участке с кадастровым номером 423683200027000025: предоставлен на праве постоянного пользования общей площадью 1,3546 га для обслуживания здания механических мастерских

Начальная цена с НДС 20 %: 1 728,00 белорусских рублей (снижена на 80 %)

Лот № 4

Зерносклад (здание специализированное растениеводства), инв. номер 420/С-77574, общей площадью 1001,8 кв. м. Адрес: Гродненская обл., Лидский р-н, Бердовский с/с, 5, в районе д. Стерково.
Сведения о земельном участке с кадастровым номером 423681303647000165: предоставлен на праве постоянного пользования общей площадью 0,6390 га для строительства и обслуживания здания зерносклада

Начальная цена с НДС 20 %: 13 464,00 белорусских рублей (снижена на 80 %)

Лот № 5

Здание бани (здание специализированное для бытового обслуживания населения), инв. номер 430/С-61953, общей площадью 45,2 кв. м, по адресу: Гродненская обл., Новогрудский р-н, Петревичский с/с, 50, здание бани юго-западнее д. Василевичи

